Мікола
МАЛЯЎКА

АДНАВЯКОЎЦЫ



Мікола
МАЛЯЎКА

АДНАВЯКОЎЦЫ



Вершы
Балады
Байкі

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1988

ББК 84 Бел 7
М 21

Рэцэнзент Леанід Дайнека

В новую книгу поэзии Миколы Малявки «Одновековцы» вошли стихи о мирной жизни советских людей, о их главной заботе — сберечь родную планету от ядерного удара.

В балладах рассказывается о мужестве фронтовиков, партизан, мирных жителей, об их силе духа, о том, как тревожное эхо войны отзывается в нашем времени.

Последний раздел сборника составляют басни, сатирические и юмористические произведения.

$М\frac{4702120200-052}{М\,302(03)-88}54-88$

ISBN 5-340-00054-0

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1988.

Не жыць
Як набяжыць,
А ісціне служыць —
Як бацька мой, як дзед.
І помніць запавет,
Пакуль рука дзяржыць
Не вечнае пяро:
— Сынок, рабі дабро!..

І часам даражыць,
Пакуль яшчэ —
Бяжыць.

[illegible]
[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

[illegible]

1



Адзінокі лебедзь

Не ў казцы чароўнай дзе-небудзь,
А ў родным раёне,
Ля вёскі Жукаў Барок,
Ён плавае,
Белы лебедзь,—
І казкай жывою
Глядзіцца на снезе
Здалёк.

Наяве —
Нібыта на здымку!
Гадаю:
Якая яго прызямліла бяда
На Нёмане тут,
Дзе і ўзімку
Крынічная —
Дыхае,
Не замярзае вада?

Чаму ён, крылаты, не ў выраі?
Чаму адзінокі?
А птахі-таварышы дзе?
Я ведаю,
Лебедзі шчырыя
Не пакідаюць
Адзін аднаго
У бядзе.

Надоўга заснежаны гоні,
Надоўга захмараны
Сінія вочы нябёс.
Спагадныя дзеці
З далоні

Частуюць лебедзя —
Кожны
Што-небудзь прынёс.

Замёр я, бяскрылы, на беразе —
І хочацца
Лебедзем стаць
У халодных снягах,
Каб ён у сябрах не зняверыўся,
Каб ён дачакаўся вясны,
Непрыкаяны птах.

Вясновы роздум

Зноў вясна...
І баразнаў кругі.
І трывога —
За сённяшні свет:
Тую сталь,
Што пайшла б на плугі,
Беражом для глабальных ракет.
Перамога ў мінулым не раз
Брала молат кавальскі трывалы
І мячы —
Свой трафейны запас —
Перакоўвала на аралы.
Ды ўрывалася зноў вайна,
Цяжка грукала,
Ідучы,—
І сярпы, і аралы яна
Перакоўвала на мячы.
Ад сусветнага міру, на жаль,
Дачакацца не можам ганца.
І вось так перакоўваем сталь,
Перакоўваем —
Без канца.
У блакітна-зялёнай красе
Неспакойны ён,
Сённяшні свет:
Дакаваліся пакрысе —
Ад мяча
Да глабальных ракет.
Ні палям, ні лугам, ні лясам
Не патрэбен ваенны мундзір.
І Зямля,
Давяраючы нам,
Галасуе плугамі за мір.

Малюнак

Мара дзіцячая:
У паднябессі —
Выбуху
Страшны клубок,—
І параможна
Яго перакрэсліў
Белым крылом
Галубок.

Бачу,
Мастачка мая
Засынае.
Ціхая ноч
У акне.
А на душы
Неспакойна:
Не знаю,
Заўтра прачнёмся
Ці не.

Радыё ўключыш,
Чытаеш газету —
Сон адбіраюць
Яны:
Цяжка трывожаць
Навіны з-за свету,
Быццам за дзень
Да вайны.

Можа,
Малюнак —
Дзіцячую мару
Спаліць агонь

На сцяне,
Самі
Згарым
Ад ракетнага ўдару,
Я і дачушка —
У сне.

Думак хвалюючых,
Думак назойлівых
Зноў разматаўся
Клубок.
Ці перакрэсліць
Іх заўтра,
На золку,
Белым крылом
Галубок?

Голуб міру

Неспадзявана сцьмеў блакіт
Ад навіны з эфіру:
Загінула Саманта Сміт —
Маленькі голуб міру.

І крылы за спіной былі,
Ды ноч там, на радзіме,—
Не даляцела да зямлі
І мамы не абдыме.

З душою чыстай, як сляза,
Яна ляцела ў заўтра
І не баялася сказаць
І прэзідэнту праўду
Пра дом наш —
Светлы і ўначы,
Пра клопат наш і мару —
Зямлю ў палёце зберагчы
Ад ядзернага ўдару.

Яна спявала пра любоў
Да краю, дзе ніколі
Не забіваюць галубоў —
Пасыльных добрай волі.

Не сцьмее памяці блакіт,
І там з усмешкай шчырай
Ляціць яна,
Саманта Сміт —
Маленькі голуб міру.

Дзіцячая Асамблея

На розум бацькоў надзея.
Збіраецца ўсё часцей
Сусветная Асамблея
Зямлян маленькіх — дзяцей.

— Абараніце! —
Звяртаюцца дзеці да нас.
Расце на зямлі крынічнай
Смяротнай зброі запас.

Падумаю, дык дзіўнавата
І страшна мне —
Бацька сам:
Звяртаюцца дзеці да татаў!
Звяртаюцца дзеці да мам!

Як быццам бацькам не дарага
Зямля, дзе працуем і спім,
Як быццам усе мы ворагі
І дзецям, і ўнукам сваім.

— Абараніце! —
Звяртаюцца дзеці да нас.
А ўжо расце і ў блакіце
Смяротнай зброі запас.

На сэрца бацькоў надзея,
І час яе спраўдзіць нам,
Сусветная Асамблея
Дарослых — татаў і мам.

Чырвоная кніга

Я думаў, што кніга — даведнік,
Прыроды партрэт.
А гэта —
Жыцця запаведнік,
Наш нерушны свет.
То рэдкую птушку, то звера
Заносім сюды —
Нібыта ў лясныя вальеры,
Далей ад бяды.
Трывога сягае нядрэмна
І ўгору, і ўглыб.
Трывога за рэдкія дрэвы.
Трывога за рыб.
Трывога за край наш.
І ў цэлым —
Трывога за свет:
Зямля пад смяротным прыцэлам
Крылатых ракет.
І я напісаў бы ў блакіце,
Каб ззяла здаля:
«У Кнігу жыцця занясіце
Планету Зямля».

Беражыце Шыпшыну...

> О Беларусь, мая шыпшына,
> зялёны ліст, чырвоны цвет!
> У ветры дзікім не загінеш,
> чарнобылем не зарасцеш.
>
> *У. Дубоўка, 1925 г.*

Беражыце Шыпшыну, нашчадкі,
Беражыце на шчасце,
Беражыце як след!

Гэта —
Дзядоў запавет.

Любаваўся паэт з дзяўчынаю
На зялёны ліст, на чырвоны цвет,
І цябе, Беларусь, шыпшынаю
Ён назваў, закаханы паэт.

Катавала вайна на дыбе,
Ды мінуліся чорныя дні —
Ты не задыхнулася ў дыме,
Ты не згарэла ў агні.

Расцвіла ты, Шыпшына мілая,
А я болю ў душы не таю:
Радыяцыя апаліла,
Апыліла крону тваю.

Не парадуе шчодрая завязь,
І трывога за карані —
Тых дзяцей, што народзяцца заўтра,
А пакрыўджаны ў нашы дні.

Ратавалі героі сціплыя
І цябе, і далёкі свет.
І на іх абеліскі сыплецца
Твой зялёны ліст, твой чырвоны цвет.

Пахавалі яго ў саркафагу,
Ды рэактар яшчэ не ачах,—
І жывыя працуюць без страху,
Каб вулканам не стаў саркафаг.

Над табою, Шыпшына мілая,
Мы схіляемся, поўныя сіл,
І змятаем з галінак пахілых
І жалобу, і ядзерны пыл.

Ад туману начнога блакітная,
Белая ў маі, калі цвіцеш,
Ты не загінула ў бітвах
І чарнобылем не зарасцеш.

Прыбярэшся з усёй краінаю
У зялёны ліст, у чырвоны цвет,
І цябе, Беларусь, шыпшынаю
Назаве ён, новы паэт.

Беражыце Шыпшыну, нашчадкі,
Беражыце на шчасце,
Беражыце як след!

Гэта —
Наш запавет.

Калючы дрот

Па тэлевізары бачым,
Як мучаць заморскі народ,—
Заместа снасцяў рыбацкіх
Завозяць калючы дрот.

І армія ўся за работу
Бярэцца, самкнуўшы рады:
Плятуць з калючага дроту
Трыгубіцы і невады.

Не ў акіян, а на сушы
Закідваюць іх часцей
І ловяць людскія душы —
Бацькоў, мацярок, дзяцей.

Прыкла́дамі ўночы будзяць,
Кіда́юць у гразь і пыл —
І задыхаюцца людзі
Ў трыгубіцах тых без сіл.

Яшчэ ў падполлі нянавісць,
Ды час настане, калі
Свабоднага гневу цунамі
Пракоціцца па зямлі.

І ў песнях герояў усхваліць,
І знішчыць калючы дрот,
І снасці рыбацкія ў хвалі
Закіне шчаслівы народ.

Хатуль

— Гэй, хатуль,
Ты адкуль?..

— З краю,
Дзе сейбітаў
Менш, чым салдат,
Брацкіх магіл —
Болей, чым хат.
А нясу я адтуль,
З-пад асколкаў і куль,
Не зямлі сваёй жменьку,
Не рэчы —
Найкаштоўнейшы
Скарб чалавечы:
　　Казкі дзіцячыя,
　　Песні дзіцячыя,
　　Мары дзіцячыя —
Ад напалму
Гарачыя...
Аднаго я баюся,
Аднаго — найчасцей:
На радзіму вярнуся —
Там не будзе дзяцей...

І пайшоў ён, хатуль.
Маці знаюць —
Адкуль.

Я твой баец, Радзіма!

ГОД 1942

I

Прабіта куляй цела — цвёрды дух.
Я твой баец і на зямлі, Радзіма,—
З гарачым сэрцам,
З гнеўнымі вачыма.
Прабіта куляй цела — цвёрды дух.
І гэта мой выратавальны круг
Цяпер, калі падняцца —
Немагчыма.
Прабіта куляй цела — цвёрды дух.
Я твой баец і на зямлі, Радзіма.

II

Скавалі цела — не скавалі дух.
Я твой баец за кратамі, Радзіма:
Знясілены —
Змагаюся вачыма.
Скавалі цела — не скавалі дух.
І гэта мой выратавальны круг —
Паставіць на калені
Немагчыма.
Скавалі цела — не скавалі дух.
Я твой баец за кратамі, Радзіма.

III

Забілі цела — не забілі дух.
Я твой баец і пад зямлёй, Радзіма:
Ляжу —
З непераможнымі вачыма.

Забілі цела — не забілі дух.
І гэта мой выратавальны круг
Цяпер, калі і дыхаць —
Немагчыма.
Забілі цела — не забілі дух.
Я твой баец і пад зямлёй, Радзіма.

Брэст

Нектар насіла пчолка ў вулей,
Чуваць было, як жаўранак спявае.
І красавалі назвы вуліц —
Лясная,
Лугавая,
Палявая.

Яны былі жывым працягам
Пясчаных сцежак і прасек імшаных.
І пахла жытам,
Сокам ягад
На ціхіх плошчах —
Гарадскіх палянах.

Як і калісьці, Брэст зялёны,
Ды болей тут сцягоў і транспарантаў.
І носяць вуліцы імёны
Маёраў,
Капітанаў,
Лейтэнантаў.

У светлым горадзе над Бугам
Яны цяпер прапісаны навекі —
І тыя, што ішлі за плугам,
І тыя, што пракладвалі прасекі.

Праводзіць Брэст гасцей-паломнікаў,
Прыводзіць Брэст шчаслівых закаханых
Да Вечнага агню,
Да помнікаў
На шумных плошчах —
Гарадскіх палянах.

І толькі ў ціхі час, на золку,
Пушчанскі лось прыблудзіцца, бывае,
Ды заляціць у госці пчолка —
Лясная,
Лугавая,
Палявая.

Суд народаў

Гарэў і ты ў вайну, мой край.
І іх, фашысцкіх верхаводаў,
За ўсе магілы
Пакараў
Не божы суд,
А Суд народаў.

На свеце тым баліць в'етнамцам,
Глядзяць адтуль — у вочы нам:
«Ці пакараны
Галоўныя злачынцы —
За В'етнам?»

На свеце тым баліць ліванцам,
Глядзяць адтуль — як праз туман:
«Ці пакараны
Галоўныя злачынцы —
За Ліван?»

На свеце тым баліць зямлянам,
Усім забітым — не да сну:
«Ці пакараны
Галоўныя злачынцы —
За Вайну?»

Яны звяртаюцца да нас,
Жывых, з адной планеты родам,—
І мусіць
Мёртвым даць адказ
Не божы суд,
А Суд народаў.

* * *

Якім ты будзеш,
Новы век?
Не раз
Тушылі мы
Вайны пажар.
Ды на кастрычшчы
Зноў
Расце запас
Ракет крылатых,
А не мар.

Аднавякоўцы мы...
Чыя віна,
Што плачам болей,
Чым пяём?
Зямля —
Наш дом,
І трэба
Думаць нам,
Як зберагчы
Агульны дом.

Аднавякоўцы мы...
Ніхто за нас,
Зямлян,
Не абяззброіць
Свет —
Каб тут,
У доме нашым,
Рос запас
Крылатых мар,
А не ракет.

Яшчэ не скрозь
У мірны дзень
Акно
Адкрыў
Шчаслівы чалавек.
І нам баліць,
І нам не ўсё адно,
Якім ты будзеш,
Новы век.

Пастух

Ясным днём і ноччу цёмнаю
Ціха круціцца Зямля.
А на ёй,
Пры нашым Нёмане,
Дзед Макар пасе цяля.

Лёгкі, ён прайшоў над рэчкаю —
І няма слядоў ад ног,
Быццам на планету грэшную
Апусціўся з неба бог.

Адхадзіў сваё з сявенькаю
І цяпер, спякотным днём,
Ад цяляці ён, сівенькі,
Адганяе аваднёў.

Дачакаўся ўнукаў, праўнукаў,
Розум ясны ён збярог,
Быццам гэта бог і праўда
Ў свеце ядзерных трывог.

І ні днём, ні ноччу цёмнаю
Не супыніць ход Зямля,
Покуль тут,
Над родным Нёманам,
Дзед Макар пасе цяля.

Спадчына

Знасіліся гімнасцёркі,
Бушлаты і шынялі.
На хатах — чырвоныя зоркі:
Тут нашы бацькі жылі.
Пад зоркамі іх не стала,
Франтавікоў, партызан.
Адны памерлі ад старасці,
Другія раней — ад ран.
Яны завяшчалі славу
Музеям і курганáм,
А зоркі на хатах ласкáвых
Пакінулі ў спадчыну нам,
Пакінулі чыстае неба —
Каб помнілі ўдзень і ўначы,
Як зоркі гэтыя трэба
Запальваць і берагчы.

Сцягі Рэвалюцыі

Прапіска
Ў іх —
Надзейная:
У сэрцы
Свята беражом.
І цішыня музейная
Трывожыць,
Як далёкі гром.

Без нас
Святыні гэтыя
Ўзлятралі
З барыкад пляча,
Натхнёныя,
Сагрэтыя
Прарочым словам
Ільіча.

Крывёй сцякалі,
Падалі
І падымаліся ўгару,
Каб так,
Над барыкадамі,
Сустрэць
Кастрычніка зару.

Яны
Пры нас
Хвалююцца
Цяпер,
Як многа год назад,
І просяцца на вуліцы
У дні ўрачыстасцей
І свят.

Ад радасці
Праменяцца,
Вітаюць
Дарагіх гасцей —
І ветэранаў-ленінцаў,
І выхаванцаў іх —
Дзяцей.

Яны,
Сцягі агністыя,
Душу высвечваюць
Да дна,
Дапамагаюць выстаяць,
Калі наваліцца
Вайна.

Не ўсюды
Неба сіняе,
І ад трывог
Зямля дрыжыць,—
Ды з гэтымі святынямі
Мы
Вечна будзем
Вольна жыць.

Дзякуй за працу

Гусцее змрок вечаровы.
І тут, на заводскім пляцы,
Сузор'ем успыхнулі словы:
«Дзякуй за працу!»

О, як яны, словы, дарэчы
Над прахадною, ля сцяга!
У іх — любоў чалавечая,
У іх — дзяржаўная ўвага.

І людзі, закончыўшы змену,
Не чуюць стомы здаровай,
Бо гэтыя словы праменныя —
Як з граматы Ганаровай.

Казка пра мову

Ведаю, кожнае слова
Мае плоць і душу.
Як нараджалася мова,
На якой гавару
І пішу?

— Ку-ку!..
— Віць-віць!..—
Гэта зязюлі і ластаўкі
Прылятала,
Каб слова
Вось так,
Па складах,
Ажывіць:
— Ку-ку!..
— Віць-віць!..

Шолах калосся,
Шэпт лістападу
Дабаўлялі ў слова
Па складу,
І яно,
Нарадзіўшыся ледзь,
Пачынала
Ша-птаць,
Ша-па-цець...

— Кур-лы!..
— Пінь-пінь!..—
Гэта журавы і сініцы
Прылятала,
Каб слова
Падняць

У музычную
Сінь:
— К у р - л ы!..
— П і н ь - п і н ь!..

Грому раскаты,
Гул вадаспада
Дабаўлялі ў слова
Па складу,
І яно,
Нарадзіўшыся ледзь,
Пачынала
Г р ы - м е ц ь,
Г р у - к а - ц е ц ь...

— Ч а й - п і ц ь!..
— П а - л о ц ь!..—
Гэта дразды і перапёлкі
Прыляталі,
Каб слова
Знайшло
Граматычную
Плоць:
— Ч а й - п і ц ь!..
— П а - л о ц ь!..

Потым у кожнае слова
Чалавек удыхнуў душу —
І нарадзілася мова,
На якой гавару
І пішу.

Князь Уладзімір

Памяці Уладзіміра Караткевіча

І навошта жалоба гучыць,
А не песня яго аб Радзіме?
Можа,
Проста ён лёг адпачыць,
Малады яшчэ
Князь Уладзімір.

Лёг надоўга, на некалькі дзён,
Так стаміўся ў паходзе...
Паверце,
Не здаюцца такія, як ён,
Не здаюцца ў палон —
Нават смерці.

Просім мы,
Чытачы —
Яго самыя верныя воі:
— Ты здалёку, Дняпро, прыцячы,
Разбудзі яго хваляй жывою!

Адкасіўся і бацька раней,
І матуля пажала калоссе.
І нікога за край наш радней
У яго, знаем, не засталося.

— Зашуміце над ім уначы
Вы, дубы векавыя і хвоі! —
Просім мы,
Чытачы —
Яго самыя верныя воі.

І напоўняцца вочы святлом,
І натхніць яго клопат найпершы —
Завяршыць «Каласы пад сярпом...»,
Дапісаць беларускія вершы.

А глыбокі і здоўжыўся сон,
Бо стаміўся ў паходзе, радзімы,
І пад белымі крыламі ён
Спіць спакойна,
Наш князь Уладзімір.

Касманаўты

У чужой староны рад і вароне.
Прыказка

А ім нялёгка недзе
Пры зорках і пры сонцы:
Працуюць людзі ў небе —
Нібы ў чужой староне.

Вандроўнікі за светам
Варонку ўбачаць — рады.
А ім жа, людзям гэтым,
Няма такой спагады.

Адкрыты імі космас —
Далёкая старонка,
Туды ад нас ніколі
Не даляціць варонка.

Паспагадайце дома,
У думках блаславіце —
Каб ім, зямлянам, добра
Жылося на арбіце.

* * *

За хатамі,
За роднымі магіламі
Глядзець у неба я люблю,
Лапаткамі, як складзенымі крыламі,
Адчуўшы пад сабой зямлю.

Жыццё не бесклапотнае, не лёгкае,
Ды не паўзу хавацца ў цень,
Хаця і знаю я:
У тых, хто лётае,
Грымоты б'юць і ў ясны дзень.

Сябры ляжаць — з апаленымі крыламі,
Сябры падказваюць з магіл:
«Не поўзай, браце!
Там, за небасхіламі,
Прастор для мар, прастор для крыл!..»

Далёка недзе навальніца ляскае,
А тут спакой
Пасля грымот —
Зямля і боль, і стому здыме ласкаю,
Благаславіць зямля ў палёт.

І я да мары дакрануся крыламі
І палячу ў наступны дзень —
Над хатамі,
Над роднымі магіламі,
Над тымі, хто запоўз у цень.

* * *

Даўно не быў у вёсцы, дома,
Сярод людзей сваіх і дрэў.
І чую раптам ад знаёмай:
— О божа, як ты пастарэў!

Дражнілі козачкай у класе,
Ды падмяніў нібыта бог —
І пагрубела,
Расплылася...
Сказаць хацеў, але не змог.

Дарог юнацкіх адысея
Як дзіўны сон —
Успомніш ледзь.
І той сівее, той лысее,
Той бегае, каб пахудзець.

Жыццё смуткуе і смяецца,
Глядзіць з трывогай нам услед.
І толькі нам самім здаецца,
Што тыя ж мы,
Што той жа свет.

Познія слёзы

Дома хату пахавалі,
Пахавалі агарод.
А яго марскія хвалі
Калыхалі з году ў год.

Цэлы век лавіў удачу.
І не плакаў цэлы век.
Распляскаў свой лёс...
Ды бачу —
Не прапашчы чалавек.

На магілы дарагія
Ён апошняе прынёс:
Вочы ў госця не сухія,
Вочы — мокрыя ад слёз.

На кладах цвіце шыпшына,
На кладах — пчаліны гуд,
Быццам прабачаюць сыну
І бацькі, і родны кут.

Дым

Найдаражэй за ўсё малому
Быў ён, той дым,
маленства дым.
Казімір Камейша

Ён з печы падымаўся, дым,
Блакітнаватымі радкамі.
І аблачынкай плыў затым
Над сцежкамі,
Над бальшакамі —
Як ліст, напісаны бацькамі.

Ад гарадскіх тваіх акон
Яна не блізка,
Пушча-хата.
Стаміўся вецер-паштальён,
Павандраваў з пісьмом багата,
Пакуль убачыў адрасата.

Над галавой радкі плывуць,
І ты вачыма толькі, ціха,
Чытаеш,
Як адны жывуць
Бацькі, Вікенцій і Ядвіга,
Чытаеш —
І ў вачах адліга.

А можа, сэрца нездарма
Трывожна б'ецца —
Не спазніся!
Шкада, не дачытаў пісьма:
Радкі апошнія унізе
Зліналі раптам, расплыліся.

Не ліст паслаў — прыехаў сам.
І адступілася трывога,
І спавядаешся бацькам
На покуці —
Бліжэй да бога,
Каб не ўтаіць ад іх нічога.

Зірнеш з удзячнасцю на печ,
Заснеш, шчасліва вінаваты:
Не расказаў бацькам найперш
Пра дым —
Той ліст блакітнаваты,
Які прывёў цябе дахаты.

На вуліцы Коласа мама жыве

На вуліцы Коласа
Мама жыве.
Нялёгка старэнькай,
Яшчэ — і ўдаве.
Як дзеці,
Не спяць
Успаміны пры ёй.
Паплача, бывае,
Над «Новай зямлёй»:
Пра Ганну чытае,
Нібы пра сябе,
Забытую там —
На жніве,
На касьбе.

Нясмела пытае,
Пра што я пішу.
Кажу:
«Пра любімага краю душу,
Пра тую зямельку,
Дзе бацька араў,
Дзе спіць пад сасною —
Наводшыбе спраў.
Пішу пра зямельку,
Пішу пра людзей,
Пішу пра звычайных,
Пра зорных —
Радзей».

Наказвае мама:
«Пяром не грашы!»
Наказвае мама:

«Праўдзіва пішы!»
Расказвае мне
Пра Міцкевічаў род,
Пра дзядзьку Якуба —
У росквіце год.
Калыша ўспаміны
Цішэй,
Карацей,
Пакуль уначы
Не прыспіць,
Як дзяцей.

На вуліцы Коласа
З мамай жыву,
Шаную старэнькую
Маму-ўдаву.
За просьбай-наказам
«Праўдзіва пішы» —
Зярнятка надзеі
Хаваю ў душы:
Нашчадкі сустрэнуцца
З мамай маёй,
Як з Ганнаю мама —
Над «Новай зямлёй».

Захацелася певўня паслухаць

За ансамблем —
ансамбль...
Як на службе,
Барабаняць,
Пяюць звышнатхнёна.
Захацелася пеўня паслухаць —
З чыстым голасам,
Без мікрафона.

Я прыехаў у родную вёску,
Каб сустрэцца з ім,
Пеўнем-салістам,
Урачыста-прыгожым
Па-свойску —
З яркім грэбенем,
З пер'ем агністым.

Кожнай шыбаю дом усміхнуўся.
Бачу, пеўнік стаіць
Каля дому.
Закурлыкаў
І змоўк —
Папярхнуўся,
Быццам сорамна стала самому.

Я ўспароўся пасля на дасвецці,
Як начлежнік, да сонца даседзеў,
Толькі пеўняў —
Ні першых, ні трэціх —
Не пачуў і далей,
У суседзяў.

А на клубе крычала афіша:
«Выступае ансамбль...»
З мікрафонам!
І ўзарвалася вечарам ціша
І на матчыным пляцы
Зялёным.

Бачу, кінуўся пеўнік хавацца,
Напалоханы звонам і свістам.
Дзе яму,
Небараку,
Цягацца
З гарадскім
Мікрафонным салістам.

Ем яечню на кухні —
Пахмуры,
А вясёлыя думкі смяюцца:
«Гэта ж трэба!
І як яны, куры,
Тут, у вёсцы,
Без пеўняў нясуцца?..»

Зачыняю акно,
Падабрэўшы,
І ляплю ва ўяўленні саліста —
З яркім грэбенем,
З пер'ем агністым,
А галоўнае —
З голасам чыстым.

На вячорках

Песня ў суседзяў
Прала кудзелю:
— *Пасею шалфею*
Ды рана ў нядзелю...

Сэрца зайшлося
Ў песні ад болю —
Цяжка прыгадваць
Горкую долю:
— *Сырая зямля,*
Расступіся!
Ад грознага мужа
Схаваюся ўнізе...

Песня з кудзеляй
Спаць адыходзіць:
— *За лютым марозам*
Шалфей не ўзыходзіць...

Лёс

З песняй бабка
Села ля акна,
З песняй весялей,
З песняй — не адна.

— *Сеяла я, сеяла,*
Сеяла авёс,
Жменька зярнятак,
Жменька — слёз.
Жала, жала,
Жала я авёс,
Жменька калосся,
Жменька — слёз.
Абівала, абівала,
Абівала я авёс,
Жменька зярнятак,
Жменька — слёз...

З песняй бабка
Плача ля акна:
Дзевяноста год
Пражыла адна.

Капае бульбу маладая

Ці ж маці ўправіцца адна?
Гарачы час не спагадае:
Праз дзень — вяселле,
А яна
Капае бульбу, маладая.

Не гледзячы,
Кідáе ўбок
Сухі бульбоўнік, пустазелле.
І што ні рух, і што ні крок —
Далей,
Здаецца, ад вяселля.

А шчокі ўспыхваюць
Ярчэй,
З-пад хусткі пасмачка спадае,
І часта здзьмухвае з вачэй
Яе дыханнем
Маладая.

Над баразной
Замрэ на міг,
За плот зірне — ад маці ўпотай,
Нібы баіцца, што жаніх
Убачыць —
У гумовых ботах.

Упаў, здаецца, Млечны Шлях
І ззяе тут, на агародзе,
Як быццам бульба
На пасаг
Так урадзіла
Ў гэтым годзе.

Школьніца

У суседзяў — вяселле...
Праз сад —
Смех,
Застольныя крыкі.
І чуваць, як на танец дзяўчат
Запрашаюць музыкі.

А яна, вучаніца, тайком,
Каб не бачыла маці,
Мые туфелькі малаком
У двары, а не ў хаце.

Не спяшаюцца бегчы гады.
А на шчоках — румянец,
Быццам гэта яе малады
Запрашае на танец.

У вачах палыхнуў і спалох —
Маці кліча, здалося,
І ў траву-мураву каля ног
Малако пралілося.

Не аклікнулі наўздагон,
І шчаслівая смяецца —
Басанож прабяжыць ля акон,
З якіх музыка льецца.

Бабіна лета

Пад бярозамі дома
На світанні не спіцца —
І стаіш нерухома,
Зачарованы быццам.

Без хмурынкі нябёсы,
І на гэтым экране
Залатыя бярозы —
У блакітным тумане.

Цішыня затрапеча —
І ад подыху ласкі
Доўга падае ў вечнасць
Ліст, сарваўшыся з казкі.

А сабака забрэша —
Як на іншай планеце:
Дакацілася рэха
І згубілася недзе.

І стаіш нерухома,
Затаіўшы дыханне,
Пад бярозамі дома —
У блакітным тумане.

Уваскрэснуць ад чараў
Немагчыма, здаецца,
Быццам выпаў ты з часу,
Хаця сэрца і б'ецца.

Чарніцы

Маме

Асляпіла грымотная ноч:
Уцякаючы ад навальніцы,
Зачапілася лета
За корч —
І рассыпала ў лесе чарніцы.

Вось дык неруш!
Да восеньскіх дзён
Іх у соснах збіраў,
У ялінах.
Закаціліся ягадкі ў сон,
Засталіся ў маіх успамінах.

Халадае высока — на снег.
Адгрымелі даўно навальніцы.
А прыеду да мамы —
І ў сне
Я, шчаслівы, збіраю чарніцы.

Не ўбывае ён,
Неруш лясны.
І шумяць, і спяваюць галіны —
Гэта дрэвы агучваюць сны,
А прачнуся — мае успаміны.

Абдарыла далёкая ноч:
Уцякаючы ад навальніцы,
Зачапілася лета
За корч —
І рассыпала ў лесе чарніцы.

Акно

Ад вёскі жыву не блізка,
Але заўважыў даўно:
Для мамы
Як тэлевізар
З экранам шырокім —
Акно.

На вуліцы пасвятлее —
І добра відаць
У акне,
Як вёска арэ і сее,
Як вёска косіць і жне.

Да ночы акно адкрыта,
І мама глядзіць
На экран —
Галубіць вачамі жыта,
Далёкага лёну туман.

У поле хочацца з дому.
Шкада,
абяссіліў час —
І рукі,
Раней нястомныя,
Не падтрымаюць калгас.

Курэй пакорміць устане,
Вады прынясе —
І ў акне:
Чакае,
Калі на экране
Нарэшце ўбачыць мяне.

Адна глядзіцца праграма,
Але дарагая яна —
І не прамяняе мама
На тэлевізар
Акна.

Клён

Памяці М. К. Міцкевіча

Не разбудзіць жураўліны крык
Лесніка вясной, у новым годзе.
«Час праб'е,—
Казаў ён, жартаўнік,—
Клёнам стану
У сваім абходзе».

Помню, падпяразваўся пілой,
І жыла ў вачах —
За лес трывога.
Не адмылі —
І ў труне смалой
Рукі пахлі, быццам у жывога.

З болем гэты рэквіем пішу.
Людзі ўспаміналі, як хавалі,
Што яго за добрую душу
Не іначай —
Братам называлі.

Дрэвы ззялі ў залатой красе
Тут, у вёсцы,
І ў лясным закутку,
Ды на дол асыпаліся ўсе —
Быццам шапкі паздымалі ў смутку.

Адляцелі птушкі да вясны,
Ды каб зналі там,
Пад цёплым сонцам,
З выраю вярнуліся б яны —
Развітацца з другам-абаронцам.

Не дажыў да пенсіі ляснік,
Адслужыў і людзям, і прыродзе.
А здаецца,
Ён у лесе знік,
Клёнам стаў ён —
У сваім абходзе.

Жывіце доўга, дзядзькі!

Над роднай вёскай, у начным блакіце,
На промні месячным іграе сон.
Заснула ўсё... І вы спакойна спіце,
Дзядзькі — Валодзя, Юзік і Лявон.

Спакойна спіце ў неспакойным свеце,
Спакойна спіце — ад трывог наўзбоч.
Як вартавы, пачуўшы шолах недзе,
Я не зводзяру вачэй у гэту ноч.

Мая радоўка!.. Спачывайце ціха,
Дзядзькі — Валодзя, Юзік і Лявон.
Не дам і ёй, бясшумнай павуцінцы,
Заплыць у ваш жывы, гаючы сон.

І ў вас былі бяссонныя радоўкі
Пасля вайны, акрэплі мы пакуль:
Вы ратавалі нас ад галадоўкі,
Як у блакаду — ад агню і куль.

Аб цішыні вы дбалі, як аб хлебе,
Дзядзькі — Валодзя, Юзік і Лявон,
Каб і над намі, у блакітным небе,
На промні месячным іграў ён, сон.

Спакойна спіце!.. Пройдзе ноч, і зноўку
Вы вернецеся самі ў свет трывог.
А я другому перадам радоўку,
Каб ваш спакой, як вартавы, бярог.

Жывіце і далей вось так, па-брацку,
Дзядзькі — Валодзя, Юзік і Лявон.
І не спяшайцеся туды, дзе бацьку
Закалыхаў навек глыбокі сон.

* * *

Вясна — сляпая...
Марыць і смяецца.
Вясна не бачыць у прыродзе слёз.
Вясной і мы не думалі,
Здаецца,
Што ён аплачваецца,
Сок з бяроз.

Асенні час
Выстуджвае нябёсы,
Па ўсіх лясах прайшоў
Асенні час —
І заплацілі золатам бярозы
Зямлі за сок,
Якім паілі нас.

Сустрэча з лесавозам

На раздарожжы сустрэліся,
Як сябры...
Вось дык госць!
Быццам з далёкай Карэліі
Едзе мая маладосць.
Многа вятроў пранеслася,
Многа сплыло вады.
І на лесавозе цесна
Сосны ляжаць —
Як гады́.
Бачыцца мне палянаю
Тое жыццё —
У тайзе:
Сосны людзьмі спілаваны,
Часам — гады...
І вязе,
Можа, самае мілае,
Самае лепшае
Лёс:
Дарагімі ўспамінамі
Гружаны ён, лесавоз.
Сосны ўстаюць над палянаю —
Тыя, што падалі з пня,
Запрашаюць
З каханаю
Заблудзіцца да дня.
Як і я, маладыя,
Хлопцы бягуць з лесасек —
І жывыя,
І тыя,
З кім развітаўся навек.
Зачакаліся, мусіць,
Рад і сам, як малы.

Чую, цвярдзеюць мускулы,
Як у тайзе —
Ад пілы...
З лесавозам сустрэліся —
І знікае ён, госць,
Быццам назад, у Карэлію,
З'ехала маладосць.

Песня

На беразе Чорнага мора
Успамінаю тайгу —
І хлопцаў, работаю зморaных,
І па моры
Тугу.

Тайга — не канцэртная зала,
Ды ў хвоях слухалі мы
Прыёмшчыцу Ніну...
Спявала —
На белай сцэне зімы.

Спявала хвалююча-шчыра,
Нібы пра сваё адкрыццё:
«Самое синее в мире
Черное море мое!..»

У песні — і хвалі,
і спёка,
А голас тужыў над тайгой:
Да сіняга мора далёка —
Як да планеты другой.

Адтайвалі сумныя вочы,
Адтайвала сэрца ў мароз —
І лёгка было варочаць
Камлі ялін і бяроз.

Як быццам у голасе шчырым
І наша жыло адкрыццё:
«Самое синее в мире
Черное море мое!..»

Хапіла і шчасця, і гора,
А песню забыць не магу —
На беразе Чорнага мора
Тайгу ўспамінаю,
Тайгу.

Высокі ціск

Васілю Кошалю

Над галавою гром
Ці белыя аблокі —
У нас, дзяцей вайны,
Заўсёды ціск высокі.
Напэўна, гэты ціск
Адтуль, з далёкіх год,
Закладзен у крыві —
Нібы асобы код.
На сэрца маці
Цяжка ціснула
Трывога,
Калі вайна прыйшла —
І стала ля парога.
Прынесла гора
Пахавальную з акопа —
На сэрца маці
Цяжка ціснула
Жалоба.
Дымілася зямля,
Прысыпаная прыскам,
І мы з'яўляліся на свет —
З высокім ціскам.
Пасля вайны
Не елі ўсмак,
Насілі зрэб'е —
І ўжо на сэрца наша
Ціснула бясхлеб'е.
За плугам мы ішлі,
Малыя хлебаробы,—
І ўжо на сэрца наша
Ціснулі хваробы.
Нарэшце —

Шчасце ў вочы
Паглядзела зблізку.
Здавалася б,
Цяпер няма
Прычын для ціску.
Ды цісне зноў трывога —
Чорны камень гэты —
За лёс дзяцей сваіх,
За лёс усёй планеты.
Ён нашым стаў
Ад першых дзён,
Твой ціск,
Радзіма,—
І гэты ціск высокі
Збіць нам
Немагчыма.

Хачу пабыць адзін

Ад людзей,
Ад грукату жалезнага
Збег на некалькі гадзін.
Я хачу падыхаць лесам,
Я хачу пабыць адзін.

Скалыхнуў галіны вецер.
Успамінаў ускалых.
Тых,
Каго няма на свеце,
Бачу ў дрэвах, як жывых.
Падыходзяць, адыходзяць
За яліны,
За кляны —
Быццам дрэвамі ў прыродзе
Зноў становяцца яны.
Успаміны,
Успаміны —
Быццам вецер верхавы,
І мацней шумяць галіны,
Можа, голас іх жывы.
Людзі — дрэвы!
Я не ўдару
Іх —
Яліну, клён стары.
А на міг, нібы да твару,
Прытулюся да кары...

Ні ў глушы лясной,
Ні ў полі,
Ні ў гарах, на дне цяснін,
Я, відаць, ужо ніколі
Не змагу пабыць адзін.

* * *

Зара мая світальная,
Далёкая зара...

Даўным-даўно я, бесклапотны,
З дзяцінства выбег, як з двара,
Дзе і цяпер гарыць пяшчотна
Мая світальная зара.
У цень нябыту адыходзяць
Сябры-равеснікі,
Радня.
І той зары цьмянее водсвет
На шыбе сённяшняга дня.

Ці шмат гадоў яшчэ ў запасе?
Збірацца ў вырай — не пара,
Ды адчуваю:
Занялася
Мая вячэрняя зара.
Адсутныя, чакаюць воддаль
Сябры-равеснікі,
Радня.
І той зары ярчэе водсвет
На шыбе сённяшняга дня.

Яшчэ адзін лісток
Апаў з календара.
Зара мая вячэрняя,
Журлівая зара...

Адыходзячы, усміхніся...

Падарылі мне кнігу старую
Аб разлуках навек і на міг.
Вяззю літар славянскіх чаруе,
І аўтограф адзін — для ўсіх.

Ён чытаецца, надпіс на кнізе,
Як чужога жыцця выснова:
«Адыходзячы, агляніся
І ўсміхніся...»
А болей — ні слова!

І ні даты, ні подпісу ўнізе.
Як загадка, гучыць сапраўды:
Адыходзячы — агляніся...
Адыходзячы?
А куды?

І на міг, і навек, як і ў кнізе,
Разлучаемся на зямлі.
Адыходзячы — агляніся...
Агляніся?
Але калі?

Я таксама аднойчы, панікшы,
Не вярнуўся ў вясну ці зіму.
Адыходзячы — усміхніся...
Усміхніся?
Але каму?

Ён дамысліцца, надпіс на кнізе,
І любоўю, і болем апаліць:
«Адыходзячы, агляніся
І ўсміхніся...
Нашчадкам на памяць».

2



Балада
пра касу, сякеру і кельму

ПРАЛОГ

На захад з баямі прайшлі пехацінцы.
Пад вечнай сасной, пры шырокім гасцінцы,
Яны палажылі сяброў баявых
У брацкай магіле —
Адной на траіх.
На свеце тым моцна, спакойна заснулі,
Не чулі, як ходзяць дажджы, снегапад.
І толькі на трэцяе лета зязюлі
Пад вечнай сасной разбудзілі салдат.
Падняцца хацелі з цямніцы на грудзе,
Ды каменем цісне на грудзі зямля.
Крычаць спрабавалі — не чуюць іх людзі
Ні там, на гасцінцы, ні тут, ля камля.
І просіць малодшы, Ягор:
«Зямля! Расступіся да зор.
Зямля! Адпусці нас дадому,
На дзень адпусці, на гадзіну —
Пяць годзікаў сыну малому,
Пяць годзікаў сыну...»
«Жаніўся б і я, ды вайна,—
Сярэдні, Мірон, уздыхае.—
Баліць: як там маці адна?
Баліць: ці жывая?..»
«Блізняты ў мяне. І дачушка,—
Старэйшы сказаў, Апанас.—
Зямля! Расступіся.
Ты чуеш?
Не мучай ты нас...»
Зямля адказала:
«З нябыту-палону

Я вас адпушчу, як салдат — у запас.
Сягоння — Ягора,
Праз тыдзень — Мірона,
Праз тыдзень яшчэ— і цябе, Апанас.
І маці,
І дзецям,
І жонкам-удовам
Вярну вас, ды толькі — з наказам суровым:
Калі і папросіць хто-небудзь,
Калі і захочацца вельмі —
Не бярыце
Ні касы,
Ні сякеры,
Ні кельмы.
Наказ мой парушыце —
Страціце сілу,
Назад забяру вас,
Назад — у магілу...»
І ўсталі яны па адным, пехацінцы,
Пад вечнай сасной, пры шырокім гасцінцы.

ЯГОР

За развілкай дарог
Не разбіты пракосы,
Баба косіць мурог,
Выціраючы слёзы.
Галаву падняла
І — чакае Ягора.
Хто ідзе ад сяла?
Шчасце, можа?
Ці гора?
Кроў ударыла ў твар
Ад трывогі і стомы.
Бачыць, не гаспадар,
Бачыць, госць — незнаёмы.

— Мой далёка, бядак,
І ні слыху ні дыху,—
Спавядаецца так,
Уздыхае паціху.—
Можа б, як і адна
Акрыяла, пакутніца,
Ды спаліла вайна,
Адступаючы, хутар.
Прыйдзе хутка зіма —
Галаднеча і сцюжа,
То не знаю сама,
Як пераб'юся без мужа.—
Твар прыкрыла рукой,
Бы ад новай бядоты.—
У дачушкі маёй,
Я баюся... сухоты.
Ці ж адпоіш вадой?
Каб ад болю не згасла,
Трэба ёй сырадой,
Ды смятана, ды масла...
— З дарагою душой
Памагу!..—
Для Ягора
Гора маці чужой —
Як уласнае гора.
Ён, устаўшы з магілы,
Рад і стоме, і поту:
Найвялікшая міласць —
Накасіцца ў ахвоту.
Рад трымценню стракоз,
Рад высокім нябёсам —
Сцеле пышны пракос
Побач з вузкім пракосам.
Тут, у свеце людзей,
Тут, у свеце вясёлак,
Быццам выйшаў з грудзей —

Не трывожыць асколак.
На пракосе сядзіць,
Натаміўшыся дужа.
А жанчына глядзіць,
Як глядзела на мужа,
Разлажыла бліны,
Здор падсоўвае:
— Ешце!..—
Бы напраўду з вайны
Муж вярнуўся нарэшце.
Пагасціў бы Ягор,
Ды пазвала дарога
У прынёманскі двор —
Плачам сына малога.
— Хай дачушка жыве,
Дачакаецца бацькі...—
І пайшоў па траве
Ў цяжкіх ботах салдацкіх.
Аглянуўся назад —
Там,
глытаючы слёзы,
Хутаранка падрад
Разбівала пракосы.
Пра касу ў гэты час
Прыгадаліся словы.
Ён парушыў наказ,
А — жывы і здаровы.
За развілкай дарог
Лёг напіцца з крыніцы —
І падняцца не змог
Пад ракітаю ніцай.
Толькі выдыхнуў:
— Ах!..
Абмірае памалу —
Ён знайшоўся ў грудзях,
Той драбочак металу.

Пад чырвонай лазой
Знерухомела цела,
І душа страказой
У блакіт адляцела.

МІРОН

Абгарэлыя вішні
Тут, пры хаце былой.
На старым папялішчы
Пахне свежай смалой.
У зацішку зялёным
Смокчуць дым цесляры,
Запрашаюць Мірона,
Бы свайго:
— Закуры!..
І цікавяцца разам
Дзяды,
Як патруль:
— Ты, служывы, куды?
— І адкуль?
— Не сакрэт, на радзіму,
У далёкі раён...
Зацягнуўся Мірон,
І ад лютага дыму
Закружылася галава.
Пахваліў:
— Не трава!
— З нашай фабрыкі гэта...
— А іду —
З таго свету,
Не сакрэт...
— Во праява!
— Ну і як там, цікава?
— Не спяшайцеся, дзед,
На той свет:

Там не курыць,
І неба без зорак —
Аняменне і морак,
Быццам трапіў у склеп.
Я там ледзь не аслеп,
Не аглух...
— Жартаўнік!
— Без касцей ён, язык!..
За работу ўзяліся
Дружна зноў цесляры:
Хто — пад вішнямі ўнізе,
Хто — на зрубе ўгары.
Як тутэйшыя ўмельцы,
Чэша бёрны Мірон —
Памагчы пагарэльцам
Падахвоціўся ён.
У зямлянцы калеюць,
А карова — ў хляве:
Малако — гэта лекі,
Што патрэбны ўдаве.
У дачушкі — сухоты,
Кашаль спаць не дае,
І лякарствам пяшчоты
Не адпоіш яе.
А Мірон па рабоце
Затужыў сапраўды —
У пяхоце на фронце,
За нябыту гады.
Гімнасцёрка прамокла,
Абрасіўся і чуб —
Аж пад самыя кроквы
Разам вывелі зруб.
— Справу ведаеш, бачым,—
Бы здзіўляецца дзед.
— Навучыўся ад бацькі,
Ён цясляр, не сакрэт.—

Пакасіўшыся, цесля
Усміхнуўся затым:
— Без сякеры няўцешна
Там, на свеце на тым?
— Вось таму і вярнуўся
Да сякеры,
Да вас,—
І Мірон усміхнуўся
Цеслярам у адказ.
Ён і кроквы памог бы
Ўзняць на верхні вянок,
Ды пазвала дарога
Плачам маці:
«Сынок!..»
Агляну́ўся на хутар —
Не паверыў вачам:
Зруб, смугою ахутаны,
Залаціўся, як храм.
Прыгадаліся словы
Пра сякеру якраз.
Ён — жывы і здаровы,
Хоць парушыў наказ.
І пайшоў бы ён, можа,
Ды глядзіць:
Убаку
Сын удовін з лімонкі
Вырывае чаку.
Па-салдацку
Знянацку,
Аж спужаўся хлапчук,
Вырваў страшную «цацку»
З кволых, тоненькіх рук.
Спалатнелы, дахаты
Бег хлапчук цераз сад,—
Лёг грудзьмі на гранату,
Лёг на выбух салдат.

АПАНАС

У двары, каля плоту,
Заспяваў калаўрот:
Гаспадыня ў спякоту
Палівае гарод.
Забаўляюцца дзеці
Тут без цацак —
З катом.
І здалёку прыкмеціў,
Што без коміна дом.

— Добры дзень! —
Павітаўся,
Пераводзячы дух.
І назад разматаўся
З пераляку ланцуг.
— Божа мой! Падалося...
— Я напіцца,
Сасмяг у дарозе...
Зноў на вал калаўрота
Наматаўся ланцуг,
Адступіла спякота
За калодзежа круг.

— От напіўся — за двух,
У запас...—
Як аддзячыў,
Сказаў Апанас.—
А чаму пяцісценка
Без коміна ў вас?

— Назапасіла гліны,
Назбірала цаглін,
Ды не ўмеюць мужчыны
Печ злажыць... Ні адзін!
— Так, задача...
— Яшчэ б!
Хоць ты крычма крычы!

І прыходзіцца хлеб
У суседзяў пячы.
— Гаспадар вінаваты...
— Мы — адны:
Муж дахаты
Не вярнуўся з вайны.
Ён у сне да мяне
Прыпаўзае, калека,
Суцяшае — у сне:
«Я прышлю чалавека,
Не пакіне ў бядзе —
Печ складзе...»
— Я прыйшоў...
— Вы?
Значыць, муж мой — жывы?
Значыць, прыйдзе?
— Дай бог...—
Плача моўчкі жанчына,
Прытуліўшы да ног
І дачушку і сына.
Кельмай гліну ў карыце
Замясіў Апанас.
Кажа:
— Цэглу нясіце —
Не памінкі ж у нас...
Да цагліны цагліну
Ён кладзе пакрысе,
Запаўняючы глінай
Ямкі, шчыліны ўсе.
Прымаўляе дарэчы,
Выціраючы пот:
— Хутка казку на печы
Замурлыкае кот...
І не зводзяць сіроты
З Апанаса вачэй,
Быццам ён — самы родны,

Быццам ён — чарадзей.
А ён глінаю жоўтай
Цэглу мазаў гусцей —
Шчыраваў,
Як для жонкі,
Як для родных дзяцей.
Пры газовачцы дымнай
Потым слеп уначы.
І сустрэў гаспадыню:
— Печ прымай!
Хлеб пячы! —
Невясёлыя ўдовы,
Ну а тут —
Хоць скачы:
Апанасавы словы —
Як ад шчасця ключы.
І пяшчотаю чыстай
Засвяціўся пагляд,
Папрасіла вачыма:
«Заставайся, салдат...»
Ды пазвала дарога
Галасамі дзяцей —
Ад чужога парога,
Ад жаночых вачэй.
Ён сірот яснавокіх
Прытуліў да грудзей —
І за жытам высокім
Знік, нібы чарадзей.
Аглянуўся на ўздыме,
Сперла ў горле пасля —
Сіняй хустачкай дыму
Печ махала здаля.
Прыгадаліся словы
І пра кельму якраз.
Ён — жывы і здаровы,
Хоць парушыў наказ.

За развілкаю ціхай
Не заўважыў хадок
У траве павуцінку —
З-пад зямлі правадок.
Стаў ён воблакам шэрым:
Сярод ясных нябёс
Гром ударыў — у сэрца,
Гром ударыў — у лёс.

ЭПІЛОГ

І разам сабраліся зноў пехацінцы.
Пад вечнай сасной, пры шырокім гасцінцы,
Прыбраўшы, зямлёю засыпалі іх
У брацкай магіле —
Адной на траіх.
Адпела, у смутку схіліўшыся, крона,
Аплакалі добрыя людзі з калгаса
Спачатку Ягора,
А потым —
Мірона,
А трошкі пазней каля іх —
Апанаса.
Яны, нарабіўшыся, моцна заснулі,
Не чуюць, як ходзяць дажджы, снегапад.
Зязюлі куваюць,
Куваюць зязюлі,
Вярнуўшыся з выраю,—
Будзяць салдат.
Дарогі,
Сцяжынкі здалёку і зблізку
Збягаюцца да абеліска,
Прыносяць вянкі,
Успаміны і гімны,
Пяшчотныя кветкі вясельныя.
І выбіты тут, на пліце надмагільнай,

К а с а,
І с я к е р а,
І к е л ь м а.
Да ног прытуліўшы маленькага сына,
Дзяцінства прыгадвае часта жанчына
На грудзе пясчаным, дзе спяць пехацінцы,
Пад вечнай сасной, пры шырокім гасцінцы.

Балада пра косы, якія не пасівеюць

ПРАЛОГ

Дастала скрутак бабка Зося,
Над куфрам разгарнула палатно —
І пасвятлела ўміг, здалося,
Як быццам сонца хлынула ў акно.
Глядзіць сама,
Глядзяць святыя
З ікон, абжыўшых цёмны кут,
Як льюцца косы залатыя —
Па чорным палатне...
«Вось гэта цуд!» —
І я гляджу на гаспадыню,
На косы, асвяціўшыя пакой.
А бабка іх, нібы святыню,
Разгладжвае дрыготкаю рукой.
Чые яны, святла палосы?
Калі і хто заплёў апошні раз?
Жалобнай стужкай лёг на косы,
На іх, святла палосы,
Бабчын сказ.
— У нас, на явачнай кватэры,
Дачку схапілі —
І ў каменны лёх...—
І падала лісток паперы.—
Астатняе вось тут, як некралог...
Кароткі ён, бы тэлеграма,
Той некралог:
«Бывай навекі, мама!
З сабой забраўшы, я не ўбачу сына.
На памяць косы пакідаю.
Зіна».

Крыху драбней,
Ад імя блізка,
За край лістка плыла прыпіска —
Апошні крык:
«Данілу змоўч пра сына.
Скажы, што адцвіла яго Каліна».
— А хто такі Даніла?
— Тутэйшы, наш...
Ну як прасцей сказаць?
Дачка яго любіла.
І да мяне заходзіў ён, як заяц.
Сям'я свая, але заўсёды
І мне дапамагаў у сенакос.
Я частавала ўчора мёдам,
Дык гэта ён, Даніла, мне прынёс.—
Пасля яшчэ і ўдакладніла: —
Ён часта прымаўляе «стала быць»,
І рэдка хто заве Данілам,
А ўсё па-свойску болей —
Сталабыць...
Сабраўшы косы,
Бабка Зося
Закрыла іх жалобным палатном —
І пацямнела зноў, здалося,
І ў хаце тут, і ў свеце за акном.

КАЛІНА

На сене маладым пад зорамі
Прысніўся сон:
Вялі ў палон дзяўчыну ворагі,
Вялі ў палон.
Далёка партызаны-сокалы
І іх пасты.
Адны кусты калін навокала,
Адны кусты.

У плечы штурхалі прыкла́дамі.
І валасы
У дзве касы дзяўчына ўкладвала,
У дзве касы.
Закрыла свет смуга трывожная,
Ды ў хмурны дзень
Заззяла валасінка кожная,
Нібы прамень.
Аслеплі на імгненне ворагі
Ад зыркіх кос —
Па жмені слёз у кожным воку,
Па жмені слёз.
Ад зрэнак слепата гарачая
Сплыла калі —
Кусты калін салдаты ўбачылі,
Кусты калін.
Сабак гайню спусцілі з прывязі,
Аднак — дарма:
Слядоў няма, нібы ад прывіду,
Слядоў няма.
Я ў сне сачыў за той дзяўчынаю,
Я знаў адзін:
Яна сама цвіце калінаю
Сярод калін.

СТАЛАБЫЦЬ

За хатай, у садзе раскошным,
Пад вішняй, пад яблыняй кожнай —
Пчаліны дамок-церамок,
Над крайнім — курыцца дымок.
Тут ён, Сталабыць, гаспадар.
Асветлен маршчынкамі твар,
А вочы — нібыта дымар
Надыхаў: зацягнуты смуткам,
Як бабчыны — тыя, над скруткам.

— Ці Зіну забыў, стала быць,
Пытаеце?
Нельга забыць...
Прыходзіць яна з маладосці,
З нябыту прыходзіць —
У госці,
Знікае, як цень, у сінечы.
Не знаюць пра нашы сустрэчы,
Не знаюць пра горыч разлукі
Ні жонка,
Ні дзеці,
Ні ўнукі.
— Гавораць, запіска была:
«Данілу скажыце —
Каліна яго адцвіла».
— Жывём у глушы салаўінай:
На кожнай паляне —
Каліна.
І Зіну той, нашай, вясной
Назваў я Калінай лясной,
Сваёй, стала быць...
А за мною
Вось гэтак,
Калінай лясною,
Яе называць пачалі
І скрозь на пушчанскай зямлі.
Як мы і кляліся калісьці,
Яна не забыла, Каліна,
Да смерці мяне, стала быць.
І мне пры жыцці не забыць.
Заўсёды, каторы ўжо год,
Гарчыць ён, калінавы мёд,
Ад смутку гарчыць ён, няйначай.
— А косы вы бачылі?
— Бачыў.
А як жа! Паказвала Зося...

Усё, што ад мар засталося,
У косы заплецена тыя,
І не пасівеюць
Яны, залатыя,
У свеце калін і бяроз.
— Скажыце, а хто іх прынёс?
— Жанчына адна, Камарыха.
Таксама набралася ліха
Яна, стала быць, у гестапа:
Кранулася з розуму баба.
Бывае, як людзі — нічога,
А часам у пограб, нябога,
Залазіць — на споведзь да бога,
Так кажа...
Дурнічка, куды? —
Пчалу з негустой барады,
Як з квецені, выбавіў дзед.—
Ляці на калінавы цвет!..
І зноў за блакітны дымар
Узяўся Даніла-пчаляр.

КАЛІНА

Туман плыве, плыве з лугоў,
Як быццам дыша,
Як быццам рэчка з берагоў
Улетку выйшла.
Я знаю, пры вадзе здавён
Расце каліна.
І, прыгадаўшы дзіўны сон,
Паклікаў: — Зі-на!
Паклікаў ціха — толькі раз,
Ды нечакана:
— Іду! — пачулася ў адказ
Адтуль з туману.
Здзіўленне, недавер'е, страх —

Усё сплялося.
Няўжо я ўбачу сну працяг?
А мо здалося?
Ці мала іх забыта, сноў,
Як казка дзіўных?
Гадаць не стаў, а ціха зноў
Паклікаў: — Зі-на!
— Іду! — пачулася ў адказ,
І я паверыў:
З туману выплыла якраз
Яна на бераг.
Вачэй не зводжу — дзве касы,
Нібыта тыя:
Таксама ззяюць валасы,
Як залатыя.
— Каліна? — шэптам, сам не свой,
Спытаў адкрыта.
Адмоўна круціць галавой:
— Я Зінаіда.
Расой умылася ў траве,
Смяецца міла:
— А так, Калінаю, заве
Мой дзед Даніла...
Як быццам зноў прысніўся сон,
Ды ў ім — не горыч.
Сялом, аж да яе акон,
Прайшліся поруч.
Рукой махнула, як свая,
І запрасіла:
— Заходзьце!
Будзем рады — я
І дзед Даніла...
На вокнах запаветных свет
Сышоўся клінам.
І я падзякаваў услед:
— Зайду, Каліна!

КАМАРЫХА

Пры сыне, хварэючы ціха,
Даходжвае век Камарыха —
Як знятая з крыжа, сухая.
Пра мужа спытаў — уздыхае:

— І мне выбірацца пара
На могілкі, да Камара...
Я выгледзеў бабку ля рэчкі,
Збірала для хатняй аптэчкі
Гаючыя травы і кветкі —
Ад розных хвароб пракаветных.
Нясе дзівасіл, прыкмячаю,
Крываўнік, лісты іван-чаю,
Трыпутнік, пучкі спарышу.
У розуме, бачу,
Прашу:
— Успомніце, бабка, пра Зіну.
— Авой! Вы пра нашу Каліну?
Скажу вам, галубчык, як сыну,
Скажу, як на споведзі ў бога:
Здавалася, месца жывога
Нямашака — мучылі гэтак.
І косы пры мне напаследак
Яна заплятала,
Шаптала
Тады ў апраметнай падвала:
«Гестапаўцы знаюць,
Што я сувязная —
Каліна лясная.
Сягоння ў іх свята,
Сягоння занятыя —
П'юць ды гуляюць.
А заўтра... мяне расстраляюць».
— І дзе пахавалі Каліну?
— Скажу вам, галубчык, як сыну,

Скажу, як на споведзі ў бога:
Не знаю...
Відаць, у любога,
Каго пахавала турма,
Магілы няма.
— А косы?
— А косы, заплёўшы праз слёзы,
Абрэзаць сама не змагла.
І я іх кавалачкам шкла
Абрэзвала Зінцы-Калінцы —
Па валасінцы,
Па валасінцы...
Іх бедная Зося хавае,
Цалуе і гладзіць, бывае,
Нібыта дачку ўваскрашае.
Паплачу і я з ёй, чужая,
Збіраю вось кветкі, траву,
А цвету з каліны не рву.
Скажу вам, галубчык, як сыну:
Увосень убачу каліну —
Здаецца, яна — у крыві,
Здаецца, адно пазаві,
Дык кожным лістком страпянецца
І Зінаю стане, здаецца...
Вось так, бы на споведзі, ціха
Раскрыла душу Камарыха,
Па каліўцу, спорна і дбала,
Зялёныя лекі сабрала,
Сказала: — І ад галавы
Пайду пашукаю травы.

КАЛІНА

Напэўна, прыгажэй мясціны
Няма на свеце:
У белым цвеце ўсе каліны,

У белым цвеце.
Цяпер пра сон і Зіна знае,
Мой сон — не тайна:
Калінай стала сувязная,
Калінай стала.
І разам мы блукаем гаем,
Абходзім пашу —
Каліну нашу скрозь шукаем,
Каліну нашу.
Нібы каліна скіне лісце,
Нібы ў тума́не
Дзяўчынай стане, як калісьці,
Дзяўчынай стане.
З туману выйдзе і пра косы
Спытае быццам
Яна — Каліна бабкі Зосі
І Сталабыця.
Каліны ў цвеце, як у шоўку.
Якая наша?
Сама не скажа, падышоўшы,
Сама не скажа.
На Зіну глянуў — дзве касы,
Нібыта тыя:
Наяве ззяюць валасы,
Як залатыя.
Яно са мною побач, дзіва:
Са сну — дзяўчына.
— Каліна! — выдыхнуў шчасліва.—
Ка-лі-на!..
Плыла зямля, плылі нябёсы —
Усё на свеце.
І асыпаліся на косы
Каліны ў цвеце...

ЭПІЛОГ

Дастала скрутак бабка Зося —
І зноў святла пабольшала ў акне,
І зноў пяшчотна разлілося
Святло ад кос —
Па чорным палатне,
Па хаце ўсёй...
Такія ж косы,
Як і ў маёй Каліны лугавой,—
Святла пяшчотнага палосы,
Не косы,
а праменьчыкаў павой.
Ды глянеш —
сэрца халадзее.
Такія ж косы —
З розніцай адной:
Яны цяпер не парадзеюць,
Яны не пасівеюць за спіной,
Яны не лягуць на падушцы,
Як Зініны —
на мужавым плячы,
Яны ні сыну, ні дачушцы
Не паказычуць тварыка ўначы,
Святла палосы...
Мёртвы скрутак,
Схаваны ў куфры,
Быццам у труне,
Ён —
матчын боль,
Ён —
матчын смутак,
Ён —
матчын непакой і ноччу ў сне.
А ў Зіны косы лёгка ўздрыгваюць,
А ў Зіны косы ўмеюць плакаць, пець —

Яны шчаслівыя, што дыхаюць,
Шчаслівыя, што могуць пасівець
На галаве...
— Не плачце, бабка,
Не плачце так над косамі,—
Прашу.
А сам аж сцепануўся зябка,
Бы зазірнуў у бабчыну душу.
Там перазахаваны разам
Дачка і муж —
Уся яе радня.
І бабка іх,
вайной забраных,
Уваскрашае ў памяці штодня,
Уваскрашае іх... і ўнука,
Як быццам нарадзіўся ён, унук.
Абдыме ў сне —
І зноў разлука,
І зноў унука
Адпускае з рук —
На свет той зноў...
Глядзяць святыя
З ікон,
Абжыўшых цёмны кут,
Як льюцца косы залатыя,
І самі пасівелі ад пакут
Яны — святыя.
Як жа з чашы
Такога гора
П'еш ты, чалавек?
А бабка Зося рукі нашы
Злучыла на імгненне
І — навек:
— Жывіце доўга, дзеткі,
Жывіце добра,
без пакут і слёз.

Няхай бацькам
прыносяць кветкі,
Няхай бацькам
не прысылаюць кос...
І свет увесь пачуў, здалося,
Як нас,
Шчаслівых,
Перад сном
Благаславіла бабка Зося,
Закрыўшы косы чорным палатном.

Балада пра калыханку

ПРАЛОГ

Жанчыны жыта жалі ў полі,
Не жалі — мучыліся болей:
Пакуль спаўюць на ржышчы сноп,
Яшчэ адзін —
Змакрэе лоб,
Смыліць ад мазалёў далонь,
Нібы ў руцэ не серп —
Агонь.
Сярпы тупыя
Ў бедных жней,
Ды шчыра,
Дбайна, як раней,
Не дапамогуць ім мужчыны:
Фашыстаў б'юць за слёзы,
За кроў людзей загубленых —
І не адбіты косы,
І сярпы не зублены...
Жанчыны жыта тут, за вёскай,
Не жалі — рвалі, дзе гусцей,
Каб хлеба даць лясному войску,
Каб накарміць сваіх дзяцей.
Жняя падумала пра мужа,
І смутак лёг на твар асмужаны:
Ці ён жывы,
Яе танкіст?
Ахвяравала б серп за ліст.
Далёкі подых навальніцы
Смугой трымцеў — пякло нясцерпна.
Жняя, сышоўшы да крыніцы,
Прысела ў цень,

Пад навісь вербаў,
Прысела ў цень —
З крыніцай тою
Загаварыла, як з сястрою.
— З мацярынскаю просьбай
Прыйшла я, жняя:
Наспявай калыханку,
Крынічка мая.
Я дачушку зімой
Прытулю да грудзей,
Запяю для яе,
Для сябе,
Для людзей.
Вечна ўдзячныя будзем
І муж мой, і я —
Наспявай калыханку,
Крынічка мая!..
Як быццам мройныя цымбалы
Зачаравалі слых спярша,
А ўжо за імі заспявала
Крыніца — добрая душа:
— *Ходзіць Бай —*
Вандроўнік вечны
Пад акном тваім.
Залатая, як сланечнік,
Шапачка на ім.
Бай, прытупваючы лёгка,
Шапачкай махне —
І закружацца пялёсткі
Над табой у сне.
Рукі маміны — падушка,
Не знайсці мякчэй,
На руках маіх, дачушка,
Засынай хутчэй...
Крыніца песню даспявала
І зноў у цішыню цячэ,

Бы сапраўды закалыхала
Дзіця, што ў будучым яшчэ.
Жняя падзякаваць не ўспела —
Акамянела быццам цела:
Гарэлі хаты канцавыя,
Гарэла жыта скрозь на ўздыме,
І жнеі мёртвыя, жывыя
Гарэлі там,
У чорным дыме,
Гарэлі, не дажаўшы жыта.
Жняя, ачнуўшыся нібыта,
Пачула стрэлы,
Лямант дзікі —
З агню ўцякалі плач і крыкі.
«Вось і па нас прыйшла вайна»,—
Яшчэ падумала яна
І пра дзіця,
Нібы іх двое,
Нібы яно, дзіця, жывое.
І, серп узяўшы, ціха з ім
Пайшла туды, у чорны дым.

ТАНКІСТ

Трывога начавала ў танку,
Трывога гнала сон —
Пра дом, пра вёску-паланянку
Заўсёды думаў ён.
На фронт спяшаўся са шпіталя,
Абпалены ў баі.
«Ратуй!..» —
Здалёк яму шапталі
Крыніцы і гаі.
І вось глядзець не можа зблізку
На мёртвы свой парог,
Як быццам той, гарачы, прысак

Яму на сэрца лёг,
Як быццам не ў блакіт, а ў вочы
Ён сплыў, той дым густы,—
І голле чорнае навокал,
І чорныя лісты.
У вёсцы — ні адзінай хаты,
У вёсцы — ні душы,
Пашкадаваў агонь пракляты,
Глядзіць, адно крыжы.
Здранцвелы, цяжка споўз з байніцы
І чорны сам, як ліст,
Пад вербаў навісь, да крыніцы,
Спусціўся ён, танкіст.
Яна адна — душа жывая
І сведка ўсіх пакут,
Здаецца, вёску адпявае,
Рыдае ў вербах тут:
— Наляцелі, як з пекла,
За д'яблаў страшней,—
На жытнёвае поле,
На стомленых жней.
Пад канвоем пагналі
І жонку тваю —
Не забілі яе,
Маладую жняю.
З паланянкамі разам,
У кучы адной,
Калыханку пагналі,
Напетую мной...
Танкіст, даслухаўшы панура,
Як пастарэў уміг.
На адпяванне,
На хаўтуры
Прывёў сяброў сваіх,
Сказаў:
— Сюды спяшалі ўсе мы,

Каб вольны смех звінеў,
А тут...—
Зняла жалоба шлемы,
У зрэнках — боль і гнеў.
Магілу выкапалі ў полі —
Апошні спрат для жней,
З якімі ён вучыўся ў школе
І сябраваў пазней.
Слязу стрымаў,
Стрымаў праз сілу,
Як там, ля ніцых верб,
І сам на брацкую магілу
Не крыж прынёс, а серп.
З душой, абпаленай бядою,
На дол не ўпаў, як ліст,
А твар абмыў жывой вадою
І ў люк нырнуў танкіст.
На захад паляцеў у танку
Шукаць яе, жняю,
І калыханку-паланянку —
Усю радню сваю.

ЖНЯЯ

У бараку радзільным
Нават печкі няма,
Сцены інеем пільна
Пабяліла зіма.
Вязні кашляюць глуха,
Просяць хворыя піць.
Пры жняі павітухай
Калыханка не спіць.
На падсцілачцы шэрай
Знемаглася жняя,
Каб зірнула ў люстэрка,
Закрычала б: «Не я!»

Твар маршчыны пасеклі,
Адцвіла маладосць,
Быццам трапіла ў пекла,
Лагер — пекла і ёсць.
Крэматорый без стомы
Днём дыміць і ўначы —
Толькі гэтак, праз комін,
Можна з пекла ўцячы.
Думкі чэпяцца хватка,
Іх жняі не прагнаць:
Няўжо прыйдзе дзіцятка,
Каб у муках сканаць?
У забойцаў найбольшых
Ёсць прыслужніца-кат:
Немаўлятак у бочцы
Топіць, як кацянят...
Калыханка згадала
Дом, крыніцу сваю,
Як малой, заспявала —
Суцяшае жняю:

— Бай, прытупваючы лёгка,
Шапачкай махне —
І закружацца пялёсткі
Над табой у сне.
А-а,
А-а,
А-а —
І закружацца пялёсткі
Над табой у сне...

Усміхнулася слаба,
Прашаптала жняя:
— Дзякуй!
Выжыві ў лагеры,
Дарагая мая.
Перамога абдыме —
Будзеш пець ты часцей,

Будзеш там, на радзіме,
Закалыхваць дзяцей...—
А ў самой
Сэрца шэрхне,
Немагчыма заснуць:
Думкі тыя, як шэршні,
Мучаць зноў,
Тнуць і тнуць —
Не заснуць...
Мілуй, божа!
Лепей дар небыцця,
Чым глядзець, як у бочцы
Захлынецца дзіця.
Вязням нельга і ціха
Наракаць на свой лёс,
І жняя-парадзіха
Плача моўчкі, без слёз.
Не зваліўся ты, хворы,
Ды асудзяць як бач —
Без чаргі ў крэматорый
Павядуць і за плач.
Ты і ў лагеры лішні,
Не паможа і бог —
Ён не ведае літасці,
Крэматорый-малох.

МАЛОХ

Дыму хмара густая —
З чалавечых касцей:
Крэматорый глытае
І старых, і дзяцей.
Ён са свастыкі метай,
Ён адразу, каб мог,
Праглынуў бы паўсвету,
Крэматорый-малох.

Праглынуў бы дубровы,
Праглынуў бы гаі,
І пявучую мову,
І надзеі жняі.
Многа прысаку трэба —
Ад аратых і жней,
Каб расла на ім рэпа
Для немецкіх свіней.
Трэба там, на папасе,
Спапялёная кроў,
Каб трава паднялася
Для нямецкіх кароў.
Ён патрэбен ім, прысак,
Каб хапала — тлусцей! —
Малака і сасісак
Для немецкіх дзяцей.
І не знае задышкі
Крэматорый-малох —
Цень ад страшнага дыму
На паўсвету ўжо лёг.
Ад зямнога парога,
Дзе іконы — святым,
Аніяк ён да бога
Не падымецца, дым,
Быццам мала адчаю,
Быццам мала ахвяр —
Чалавечага шчасця,
Калыханак і мар...

ЖНЯЯ

Недзе там, на радзіме,
Калядуе куцця.
А ў бараку радзільным
Закрычала дзіця,
І яго саграваe,

Прытуліўшы, жняя,
Шэпча — быццам спявае
Тут крыніца-бруя:
    — *Рукі маміны — падушка,*
    Не знайсці мякчэй,
    На руках маіх, дачушка,
    Засынай хутчэй.
        А-а,
        А-а,
        А-а —
    На руках маіх, дачушка,
    Засынай хутчэй...
Думка тнула балюча:
Калядуе вайна —
І за дротам калючым,
А не дома яна.
Так чакалі дачушку,
Так чакалі каляд,
Ды не бацька пачуе
Плач дзіцяці, а кат.
І закрыюцца вочы
На пачатку жыцця —
За баракам, у бочцы,
Захлынецца дзіця...
Ноч не спала, а ранкам
У бараку — спалох:
Пра жняю-паланянку
Ён успомніў, малох.
Заклінаючы бога,
Прагла — як дабрыні:
«Божа, толькі б не ў бочцы,
Разам лепш —
У агні...»
Прыбірала дачушку,
Бы збіралася ўпрочкі,
Заспявала ледзь чутна,

Не спускаючы з бочкі
Вачэй:
— А-а,
А-а,
А-а —
На руках маіх, дачушка,
Засынай хутчэй.
Можа, дома пад вярбою,
Можа, пры сасне
Зноў сустрэнемся з табою
Там ужо, у сне.
А-а,
А-а,
А-а —
Зноў сустрэнемся з табою
Там ужо, у сне...
Не спалохалі песню
Ка́ты, крыкнуўшы: «Стой!»
І дачушку пранесла
Міма бочкі з вадой.
Уздыхнула з палёгкай,
Пад канвоем хаця,
Бы радзіме далёкай
Аддавала дзіця...
Сталі полымем,
Дымам,
Аблачынкай малой —
І на ўсход, на радзіму,
Паплылі над зямлёй.

ТАНКІСТ

Бягуць з баракаў людзі-цені,
А радуюцца так:
Упаўшы доле, на калені,
Жагнаюцца на танк,

Смяюцца,
Скачуць урачыста —
Нібыта ўпершыню,
І ўсе цалуюць і танкіста,
І родную браню.
Сярод баракаў пачарнелых
Стаіць ён, грозны танк,—
Гарачы ад хады і гневу,
Гарачы ад атак.
«За калыханку!» —
Ззяюць словы,
Бы квецень, на брані —
Не абабіў іх град свінцовы,
Не адцвілі ў агні.
Танкіст гарэў,
І цень пажару
Дагэтуль не ачах:
Чарнее прысакам на твары
І дымам — у вачах.
Ён ратаваў дамы, зямлянкі
Ад полымя,
Ад куль,
Ды ні жняі, ні калыханкі
Не адшукаў пакуль...
А вязні плачуць і смяюцца,
Бягуць — аж пыл з-пад ног,
Каб хоць рукой брані крануцца,
Нібы на танку —
Бог.
Праз вязняў збой і калыханка
Прабілася здаля.
— Ці не маё імя на танку,
Бо калыханка я?
— А дзе жняя?..—
Яна, як птушка,
Забілася ў руках —

І расказала пра дачушку,
Пра дым і прысак-прах,
Пра цэлы мацярык дзіцячы,
Утоплены ў вадзе,—
Праўдзіва расказала, з плачам,
Як сведка — у судзе.
— А вёска дзе?
— Няма магілы нават,
Спалілі нашых тут
У полымі нянавісці,
У полымі пакут...—
І паказала скрушліва
На комін,
Праз які
Прайшлі яны,
Жняя з дачушкай
І вязні-землякі...
Танкіст цяжэй прыгорбіў плечы,
Ні слова не сказаў,
А па шчацэ,
Агнём скалечанай,
Скацілася сляза.
Зірнуў на крэматорый кляты
І вытрымаць не змог —
Ударыў ён, суддзя, з гарматы
У страшны той малох.

ЭПІЛОГ

За вёскай скрозь, да небакраю,
Спявае жыта,
Жыта грае.
Не поле — звонкія цымбалы,
Музыка ён, камбайнер дбалы.
Бярэ за гранне чыстым золатам,
Яно пазней ужо,

Размолатае,
Дасць людзям хлеб,
А з хлебам — сілу.
Камбайнер, залаты ад пылу,
Старацца рад —
Зажынак свята.
Іграе так натхнёна, звонка,
Таму што побач з полем хата,
А ў хаце — лад,
Спявае жонка:

— Ходзіць Бай —
Вандроўнік вечны
Пад акном тваім.
Залатая, як сланечнік,
Шапачка на ім.
Лю-лі,
Лю-лі,
Лю-лі —
Залатая, як сланечнік,
Шапачка на ім.
Бай, прытупваючы лёгка,
Шапачкай махне —
І закружацца пялёсткі
Над табой у сне.
Лю-лі,
Лю-лі,
Лю-лі —
І закружацца пялёсткі
Над табой у сне...

З акна, расчыненага ў жыта,
Далёка голас ціхі льецца.
Адтуль, з вайны,
Адтуль, з нябыту,
Жняя вярнулася, здаецца.

— Рукі маміны — падушка,
Не знайсці мякчэй,

На руках маіх, дачушка,
Засынай хутчэй.
Лю-лі,
Лю-лі,
Лю-лі —
На руках маіх, дачушка,
Засынай хутчэй...
Жняя —
Не тая...
Калыханка —
Яна, былая паланянка.
Цяпер ужо, у мірны час,
Крыніца ў засені вярбовай
Ёй нашаптала новы сказ —
Пяшчоты словы,
Шчасця словы:
— Бай таксама любіць ласку,
Бай пазней засне,
І табе, дачушка, казку
Ён раскажа ў сне.
Лю-лі,
Лю-лі,
Лю-лі —
І табе, дачушка, казку
Ён раскажа ў сне.
Дачушка мілая —
Не тая...
І ўжо цымбалы не гучаць,
І даль, ад жыта залатая,
Раптоўна сцьмела на вачах.
Глядзіць камбайнер, боль адчуўшы,
Як аблачынка ў свет плыве,—
Жняі яго,
Яго дачушкі
Магіла там, у сіняве.
І на зямлі, у гэтым полі,

Ёсць астравок жалобы, болю —
Магіла жней,
Якім не давялося
Для Перамогі хлеб спячы.
Камбайнер ім вянок з калосся
Паклаў, дахаты ідучы.
Каб мог, даўно вянок такі ж
І ў неба тут, над збажынаю,
Узнёс бы ён —
Былы танкіст,
З душой, абпаленай вайною.
Ён дбае аб надзённым хлебе,
І не забудзе ён да смерці
Магілы дарагія ў небе,
Магілы на зямлі —
І ў сэрцы.

3



На памяць

З вачэй маіх
Яшчэ не знік,
Яшчэ не збег у ноч цягнік.
І ты стаіш —
Ужо адна —
У рамцы светлага акна,
Як быццам падарыла мне
Свой фотаздымак —
У акне,
Каб я ў душы яго бярог,
Каб я забыць цябе не мог.

Вяснушка

«Я — Вяснушка...» —
Ты спявала вясной,
Галасістая птушка
З ціхай вёскі лясной.

Рана ў соснах жывых
Абарваўся твой спеў.
І прызнацца ў любві
Я табе не паспеў.

Ты прыснілася мне
Памінальнай вясной
Не ў вянках,
Не ў труне —
На сцяжынцы лясной.

Бы вярнулася зноў,
Як вяртаюцца птушкі.
Смешна лупіцца нос,
А на шчоках — вяснушкі.

І прызнанне ў любві
Я пачуў пад сасной:
«Ты шчаслівa жыві!
Без мяне —
Як са мной...»

Рэха

Рэха бегае па лесе
Ясным днём — як у тумане.
У гушчар дрымучы лезе,
Замірае на паляне.

Цёмна ў елках, як уночы.
Заблудзілася, магчыма,
Рэха з голасам дзявочым,
Рэха з яснымі вачыма.

Я пайду як на сустрэчу,
Свой у лесе, дзякуй богу.
І спалох з вачэй адпрэчу,
Пакажу дамоў дарогу.

А дадому не захоча —
Павяду з сабой, магчыма,
Рэха з голасам дзявочым,
Рэха з яснымі вачыма.

Рутка

Знаёмства нечаканае
Забудзецца не хутка:
Імя ў яе духмянае —
Р у т к а.

Халаднавата-свежая,
Як рута на дасвецці,
І расцвітае ўсмешкаю.
І вочы — як суквецці.

Я ведаю, замужняя,
А недалёка сядзе —
І галава закружыцца,
Як у вясновым садзе.

Другім даўно сарваная,
А не завяла хутка:
Імя ў яе духмянае —
Р у т к а.

Павуцінка

Пад асеннім сонцам
Зззяе павуцінка,
Як крышталік чысты —
Кожная расінка.

На старым гасцінцы
Я шчасліва мару:
Гэтыя кара́лі
Вам былі б да твару.

Ды крані — парвецца
Нітка павуцінкі,
І сплывуць у восень
Яркія расінкі.

Я падумаў, сумны,
На старым гасцінцы:
«Вось і ў нас таксама
Усё — на павуцінцы!»

Апошні след

Завея прыціхла ля дому,
Як сваця пры маладых.
У сані свае,
На салому,
Саджае цябе жаніх.

Шчымлівага смутку прылівы,
І думка адна гняце:
Сягоння абраннік шчаслівы
Касу тваю распляце.

Я ласкай тваёй не сагрэты,
А стала яшчэ радней —
І тонкай саломінкай гэтай,
Упаўшай з вясельных саней.

Падняў...
І сэрца адтала,
Бы гладжу твае валасы —
Саломінка залатая,
Як валасінка з касы.

А сэрца зноў ледзянее,
Шчыміць, як ніколі раней,—
Навек замятае завея
Апошні след ад саней.

Пад вішняю белай...

Пад вішняю белай
Вясна расцвіла,
І зноў пра цябе мне
Спявае пчала.

Радзімкі прысняцца.
Яны і ўначы,
Як мёд, залацяцца
Ў цябе на плячы.

Нібыта ў пагоду,
Калі ты цвіла,
Дзве кропелькі мёду
Згубіла пчала.

Блакітны замак

Я збудаваў з надзей
Не дом, а цэлы замак —
Употай ад людзей
І ад цябе таксама.

Няма свайго двара,
Няма ніводнай вішні.
І ты за цесляра
Далёка замуж выйшла,
За дом яго, за сад,
За новае карыта —
Дарог няма назад,
У замак мой блакітны.

І я, дзівак, нібы
Раскрыў нарэшце тайну:
Табе патрэбен быў
Не замак —
Дом звычайны.

Журботны трыпціх

КАЛОДЗЕЖ

Вяртаюся ў даўні час,
Іду па слядах тваіх.
Я думаў, што будзе ў нас
Калодзеж —
Адзін на дваіх.

Курлыча ў двары асвер,
Курлыча — кліча...
Дык не ж!
Ты шчасце сваё цяпер
З другога калодзежа п'еш.

Як у маладыя гады,
Хаджу ў ненатольнай журбе:
Зачэрпаю дома вады —
І ўспомню,
І ўбачу
Цябе.

СТОЛ

Вяртаюся ў даўні час,
Сатканы з хвілін дарагіх.
Я думаў, што будзе ў нас
І стол —
Адзін на дваіх.

Абрус на стале — у кветы,
І лавы засланы святлом.
Ды гаспадыняю ты
Сядзіш за другім сталом.

Шчаслівыя людзі вакол,
А шчасце маё — у журбе:
Прачнуўшыся, сяду за стол —
І ўспомню,
І ўбачу
Цябе.

РУЧНІК

Вяртаюся ў даўні час —
Да вуснаў, да рук тваіх.
Я думаў, што будзе ў нас
Ручнік —
Адзін на дваіх.

На ўсё жыццё дарагім
Не стаў для цябе, дарагой.
Ты дзеліш ручнік з другім,
І я таксама — з другой.

Як быццам урок чараўнік,
Каб вечна хадзіў у журбе:
Ссівеў, а вазьму ручнік —
І ўспомню,
І ўбачу
Цябе.

Фота

Любіш фота —
Памяць
Пра дзявочую красу:
Ты з пяшчотай
Расплятаеш
На грудзях
Касу.
Знаюць нівы,
Знаюць гаці,
Кладкі і брады:
Муж шчаслівы
На руках
Цябе
Насіў тады.
Прымяраўся
На дваіх
Адзін веласіпед —
І хістаўся,
І здаваўся
Цесным
Белы свет.
Ды ў дарозе
Старасць
Не мінеш,
Як ні круці.
Не збылося
Самае галоўнае
Ў жыцці.
І трывожыць
Думка-спадарожніца
Часцей:
Гэта ж, можа,
І за шчасце

Бог не даў
Дзяцей?
Каб адчула
Ты трывогу,
Песцячы касу,—
За дачушку
Аддала б
Тады
Сваю красу...
Фота светлае,
Ды ад хвалявання
Цьмее зрок:
На сябе ты,
На шчаслівую,
Глядзіш
Здалёк.
Сёння знаеш:
Пустацветам
Адцвіце краса —
І ў дзявоцтва,
На касу,
Скацілася
Сляза.

Сустрэча

За кіламетрамі разлукі
Я ўспамінаў цябе
Вясной,
Нібы ляпіў —
І твар, і рукі,
Каб ты заўжды была са мной.

Дыханнем грэў,
Ляпіў без спешкі.
А ты халодная была,
Нібы скульптура —
Без усмешкі
І без душэўнага цяпла.

І вось
Душу ўдыхнула ў цела
Сустрэча —
Рук маіх парыў,
Як быццам ты не прыляцела,
Як быццам я цябе стварыў.

Смага

Б'е крынічка ў лузе з сілай,
Б'е-віруе,
Б'е-кіпіць...
— Адвярніся,—
Папрасіла,—
Не глядзі, як буду піць.

Я прысніў цябе, здалося.
Над крынічкаю — капеж:
Разліваючы,
З далоняў
Ты халодны кіпень п'еш.

Вочы ясныя смяюцца,
Вусны ўздрыгваюць ледзь-ледзь —
Немагчыма адвярнуцца,
Немагчыма не глядзець.

І прызнаннем я, бязвольны,
Наталіў сваю тугу:
— Ад цябе ў жыцці ніколі
Адвярнуцца не змагу!..

Дождж

За сцяной дашчанаю —
Бляск і цень,
Затрымаў каханую
Дождж на дзень.

За сцяной дашчанаю,
Дня апроч,
Затрымаў каханую
Дождж на ноч.

За сцяной дашчанаю
Сек і сек,
Затрымаў каханую
Дождж навек.

Альбомны верш

Як праменьчык пяшчотны,
Маршчынка на лбе.
Ты аж ззяеш уся ад здзіўлення:
З галавы і да ног,
Хто як мог,
Абдарылі цябе,
Дарагая,
У дзень нараджэння.

Ну а я выбіраў,
Каб не здолела зняць,
Каб найлепшы за ўсе падарункі.
І не бачыць ніхто,
І не чуе ніхто,
Як звіняць
Завушніцы —
Мае пацалункі.

Буслінае пяро

Я пяро прынёс дахаты.
Добры знак, нябось:
Госць высокі,
Госць крылаты
Скінуў нам пяро з нябёс.
Падарунак незвычайны.
Для буслоў не навіна,
Для буслоў, відаць, не тайна,
Што дачушка ў нас —
Адна.
Дома, над калыскай сына,
Закалышам мы зару,
І тады
Пяро буслінае
Я суседу падару.

* * *

Успамінаюцца ночы —
Тыя, кароткія, дзіўныя:
Рукі твае дзявочыя
Не даваліся —
Дзікія...

Святкавалі заручыны
Мы — маладыя, шчаслівыя.
Ласкай былі прыручаны
Рукі твае палахлівыя.

Дзе яны,
Ночы кароткія?
Дзе заручальная музыка?
Рукі, калісьці дрыготкія,
Спяць спакойна —
Замужнія...

Думаю з жалем вялікім:
Ласкай абрабаваныя,
Болей не стануць
Дзікімі
Рукі твае паслухмяныя.

У садзе першага спаткання

Ты мне ўяўлялася рабінай
У самым росквіце красы:
Буялі скрозь,
На ўсіх галінах,
Пялёсткі цвету —
І расы.
Як і ў прыродзе,
У каханні
Ёсць цвету час —
І час пладоў.
У садзе першага спаткання
Апала шмат гадоў.
І зноў
Ты мне ўяўляешся рабінай:
Як знак дабра,
Як новы дар,
Красуе скрозь,
На ўсіх галінах,
Не белы цвет —
А гронак жар.
У садзе першага спаткання
Настане зноў
Пара абноў:
Як і ў прыродзе,
У каханні
Любыя фарбы ёсць.
І зноў
Ты мне уявішся рабінай,
На схіле дзён аздобіш свет:
Заззяе скрозь,
На ўсіх галінах,
Не гронак жар —
А снегу цвет.

4



Балерына

Абрыдла за адрынай
Свінні ў гразі ляжаць —
На сцэне балерынай
Свіння рашыла стаць.
Пачухалася бокам,
Прарохкала Казе:
— Змагу і я падскокваць
Так, на адной назе.
Жыццё змяніць не позна,
Пабачыш, пройдуць дні —
І будуць вашы козы
Зайздросціць мне, Свінні...
На лузе коз сабрала,
Сама ўспаўзла на мост —
І ўстаць паспрабавала
Свіння на поўны рост.
Ды надта многа здору,
Трасецца, як жывы,
Свіння не можа ўгору
Падняць і галавы.
Спацела, цяжка дыхаць,
Як быццам спутаў страх,
І перастала дрыгаць
На чатырох нагах.
Каза сказала проста:
— Свіння, са сцэны злазь!..
І «балерыну» з моста
Сцягнулі зноў у гразь.

Да сённяшняга дня
Смяюцца ўсе адкрыта: «Вось так!
Танцуй, свіння,
Каля свайго карыта!»

Модныя падцяжкі

Дзе, калі падзеі
Адбываліся — замнём.
Наш Мядзведзь надзейна
Падпяразваўся рамнём.
Неяк пры нагодзе
Сват сказаў яму, радні:
«Дарагі! Не ў модзе
Скураныя рамяні!..»
Любіць смачна з'есці,
Не збіраецца худзець —
І падцяжкі дзесьці
Ён за мёд дастаў,
Мядзведзь.
Раз падцяжкі ў модзе,
Дык надзеў іх — і ў раён:
Там на нейкім сходзе
Выступаў з дакладам ён.
Каранасты, цяжкі,
З жыватом, як варыўня,—
І штаноў падцяжкі
Не ўтрымалі без рамня.
Дзякуй, сам адзначыў,
Што трыбуна — быццам стог,
І ніхто не бачыў,
Як штаны спаўзалі з ног.
Біла ў ладкі зала,
Бедны, ён і сам быў рад:
Без штаноў, а ўдала
Дачытаў усё ж даклад.
Дзе, калі падзеі
Адбываліся — замнём,
Зноў Мядзведзь надзейна
Падпяразаны рамнём.

Я не супраць рэчаў новых,
Смелых думак, прапаноў,
Ды глядзіце,
Каб аднойчы
Не застацца без штаноў.

Сарока

Сабакі ўскоквалі — і драла,
Калі Варона горла драла
На самадзейнай сцэне —
Плятні.
А голасу — не цэняць.
Ані!
Тады ў святочны дзень
Варона зганьбіла пляцень
І каркаць стала з новай сцэны —
Ражка тэлеантэны.
— Чаго дзярэшся так высока? —
Спытала з коміна Сарока.
— Кар-рэктнай будзь!
Хвалюся рэдка,
Ды зараз не ўтаю:
Па тэлевізары, суседка,
Я ў оперы пяю —
Чуваць далёка...
Сарока
Здзіўленне не хавае:
«Варона ў оперы спявае!
Ну і ну!»
І ўміг разнесла навіну:
— Па тэлевізары натхнёна,
Як Салавей,
Пяе Варона...
Пра гэта, не змаргнуўшы вокам,
Сарока баяла сарокам —
Рэкламным служкам,
А тыя ўжо — астатнім птушкам.
Вось так пайшла гаворка:
Варона — оперная зорка!

Бывае, і сярод людзей
Варона ўзносіцца высока:
Зрабіць рэкламу дзе-нідзе
Яшчэ знаходзіцца сарока.

Рукі

Каб падсілкавацца крышку,
Гаспадар прыйшоў з двара.
Пазалочаная Лыжка
Пахвалілася:
«Я
Кармлю Гаспадара!»
«Ты? —
Здзівілася,
Затрымцела блізка
Распісная Міска.—
Што за тон?
З Міскі чэрпаеш булён.
Зразумець даўно пара:
Я
Кармлю Гаспадара!»
«Ат, пустая спрэчка!
Час падвесці рыску,—
Умяшаліся дарэчы
Рукі,
Што трымалі Міску.—
Бачым, цяжка вам даўмецца,
Скуль булён бярэцца.
Робім без прынукі
Мы —
Мазолістыя Рукі,
Каб хапала
Хлеба,
Бульбы,
Сала,
Каб над Міскай пáра
Падымалася, як хмара.
Зразумець усім пара́:

Кормім
Мы
Гаспадара!»

Дадаць яшчэ ахвота:
Міскі,
Лыжкі,
Пазалота —
Таксама рук работа.

Аверкаў почырк

Аверка верш прыдумаў.
Зляпіў сяк-так куплеты —
І адаслаў без шуму
Ў рэдакцыю газеты.
Ды адказаў праз месяц
Літкансультант Кузьма:
«У вас
Свайго,
Адметнага,
Почырку няма».
Не ўпаў Аверка духам
І так рашыў праблему:
Не новы верш прыдумаў,
А цэлую паэму.
Прыйшоў адказ праз месяц,
І зноў сцвярджаў Кузьма:
«На жаль,
У вас
Адметнага
Почырку няма».
Любіў пісаць Аверка
Пра бэз, туман, стрыжоў,
Цяпер закінуў вершы —
На прозу перайшоў:
«Таварышы не бачаць,
Не знаюць, а дарма,—
І п'яніца, і бабнік,
І злодзей ён, Кузьма.
Чужыя думкі крадзе,
Жыве як труцень век.
І на такой пасадзе
Ён шкодны чалавек!..»
Карпеў тайком упарта

Аверка ўсю зіму,
Аверка да інфаркту
Вось так давёў Кузьму.
Сабрала пісьмаў нізку,
Здзівіла ўсіх праверка:
Празаік ананімны
Па почырку — Аверка.
А ён сказаў назаўтра:
«Дарма сцвярджаў Кузьма,
Што ў маладога аўтара
Почырку няма!..»

Аверкі ноч не спяць,
Збіраюць гразь і злосць,
Каб толькі даказаць,
Што ўласны почырк ёсць.

Разумны дурань

Даўным-даўно на свеце
Жылі сабе браты.
Старэйшы так — як вецер:
Вясёлы, ды пусты.
Малодшы — пан над борам,
Смалой прапах, як корч:
На смалакурні чорнай
Пацее дзень і ноч.
Старэйшы брат гуляе
Далей ад смалакурні,
Пад'еўшы, прымаўляе:
«Работу любяць дурні!»
Малодшы гнецца крукам
У калаўроце дзён —
Прыгожы дом адгрукаў
І ажаніўся ён.
Старэйшы брат гуляе
Далей ад смалакурні,
Падпіўшы, прымаўляе:
«Акручваюцца дурні!»
Малодшы пні карчуе,
У печы парыць зранку,
А вечарам дачушцы
Спявае калыханку.
Старэйшы брат гуляе
Далей ад смалакурні,
Ссівеў, а прымаўляе:
«Дзяцей калышуць дурні!»
Канец жа прытчы сумны:
Мінуў за годам год —
І ясна стала,
Хто разумны,
А хто — дурны як бот.

І ў нашы дні
Далей ад смалакурняў
Хапае іх,
Разумных дурняў.

Як Ваня зубы замачыў

Уставіў Ваня зубы,
Спыніўся каля крамы —
Румяны, пышначубы,
І зубы — як рэклама.

З палучкі ўзяў «Зуброўку»,
Сказаў пры ўсім народзе:
— Я замачу абноўку,
Каб не ржавела ў роце!..

Забавіўся з сябрамі,
Хвалілі:
— Во мужчына!
З бліскучымі зубамі
Не Ваня, а карціна!..

Спачатку цалаваўся,
А захмялелі ногі —
Да слупа ён чапляўся,
Крычаў:
— Сыдзі з дарогі!..

Як вярнідуб, здаровы,
Ды сам з дарогі збочыў —
І ноч у нейкім рове
Праспаў, заліўшы вочы.

Прачнуўся ён, памяты,
Пасля ў халодным поце,
Глядзіць —
Няма зарплаты,
Няма зубоў у роце.

— А ўсё яна, «Зуброўка»! —
Кляне ў бутэльцы змея.—
І сапраўды абноўка
Цяпер не заржавее...

Пабрыўся дома чыста,
Адшараваўся ў ванне —
І да свайго дантыста
Пайшоў па зубы Ваня.

Шэры госць

З народнага

Касіў Сабака сена
Для сваяка Вала,
Трава яму ў калена —
Ад лесу да сяла.
Абліўся потам, змогся —
Касіў адзін за трох.
І на пракосе ўлёгся,
Заснуў без задніх ног.
Не баязлівец слабы,
А ўскочыў — і дрыжыць:
Прыблудны Воўк у лапах
Касу яго дзяржыць.
І кажа:

— Лес ваш — бедны,
Аббег з канца ў канец —
Зайцоў няма і следу.
Я з'ем цябе, касец!

— Якраз вяселле сёння
У майго гаспадара,—
Сабака ўзвыў спрасоння,—
Дык там — касцей гара,
Дык там — каўбасы, студзень
І піва, воўча, ёсць.

Ты на вяселлі будзеш
Жаданы самы госць.
— Вядзі! Прагонім смагу,
Закусім,— кажа Воўк.
І над касцом для страху
Зубамі шчоўк ды шчоўк.
Прывёў Сабака, вучыць:
— Пад лаву хвост схавай,

А заспяваюць гучна —
З гасцямі не спявай!..
Ваўка садзіцца просяць,
Падколваюць крыху:
— Спякота! Сена косяць,
А дзядзька ў кажуху!
— Дзівак!..—
Рагочуць госці,
Кругом вясёлы гуд.
А «дзядзька» моўчкі косці
Грызе, залезшы ў кут.
Паслухаліся свата,
І аж уздрыгнуў дом —
Для маладых дзяўчаты
Запелі за сталом:
Папросім лесніка,
Каб нам зладзіў ваўка,
У лес на ім паедзем —
Па казкі вашым дзецям...
Закуска ў рот не лезе,
А пець жаданне ёсць —
І ў хаце, як у лесе,
Завыў ён, шэры госць:
Засне пастух —
Пайду на луг,
Злаўлю кажух
З аўчынак дзвюх...
Аж анямелі госці
Тут у сваю чаргу:
Дык вось хто любіць косці,
Пацее ў кажуху!
І спевака ляснога
За хвост хутчэй — ды ў круг,
Сілком з яго, жывога,
Хацелі зняць кажух.
Хто ў лоб качалкай перыў,

Хто качаргою тоўк.
І ледзь назад, за дзверы,
Уцёк з вяселля Воўк.
А я вам казку следам
Прынёс з таго сяла,
Дзе сена косіць летам
Сабака для Вала.

ЗМЕСТ

1

Адзінокі лебедзь 6
Вясновы роздум 8
Малюнак 9
Голуб міру 11
Дзіцячая Асамблея 12
Чырвоная кніга 13
Беражыце Шыпшыну... 14
Калючы дрот 16
Хатуль 17
Я твой баец, Радзіма! 18
Брэст 20
Суд народаў 22
*** Якім ты будзеш, новы век?.. 23
Пастух 25
Спадчына 26
Сцягі Рэвалюцыі 27
Дзякуй за працу 29
Казка пра мову 30
Князь Уладзімір 32
Касманаўты 34
*** За хатамі... 35
*** Даўно не быў у вёсцы... 36
Познія слёзы 37
Дым 38
На вуліцы Коласа мама жыве 40
Захацелася пеўня паслухаць 42
На вячорках 44
Лёс 45
Капае бульбу маладая 46
Школьніца 47
Бабіна лета 48
Чарніцы 49
Акно 50
Клён 52
Жывіце доўга, дзядзькі! 54
*** Вясна — сляпая... 55
Сустрэча з лесавозам 56
Песня 58
Высокі ціск 60

Хачу пабыць адзін 62
*** Зара мая світальная... 63
Адыходзячы, усміхніся... 64

2

Балада пра касу, сякеру і кельму 66
Балада пра косы, якія не пасівеюць 78
Балада пра калыханку 90

3

На памяць 106
Вяснушка 107
Рэха 108
Рутка 109
Павуцінка 110
Апошні след 111
Пад вішняю белай... 112
Блакітны замак 113
Журботны трыпціх 114
Фота 116
Сустрэча 118
Смага 119
Дождж 120
Альбомны верш 121
Буслінае пяро 122
*** Успамінаюцца ночы... 123
У садзе першага спаткання 124

4

Балерына 126
Модныя падцяжкі 127
Сарока 129
Рукі 131
Аверкаў почырк 133
Разумны дурань 135
Як Ваня зубы замачыў 137
Шэры госць 139

Маляўка М.

М 21 Аднавякоўцы: Вершы. Балады. Байкі:— Мн.: Маст. літ., 1988.— 143 с.

ISBN 5-340-00054-0.

Малявка Н. А. Одновековцы: Стихи. Баллады. **Басни.**

У новую кнігу паэзіі Міколы Маляўкі «Аднавякоўцы» ўвайшлі вершы аб мірным жыцці савецкіх людзей, аб іх галоўным клопаце — зберагчы родную планету ад ядзернага ўдару.

У баладах расказваецца аб мужнасці франтавікоў, партызанаў, мірных жыхароў, аб сіле іх духу, аб тым, як трывожнае рэха вайны адгукваецца ў нашым часе.

Апошні раздзел зборніка склалі байкі, сатырычныя і гумарыстычныя творы.

М $\frac{4702120200-052}{М 302(03)-88}$ 54—88 **ББК 84Бел7**

Литературно-художественное издание

МАЛЯВКА НИКОЛАЙ АЛЕКСАНДРОВИЧ

ОДНОВЕКОВЦЫ

Стихи. Баллады. Басни

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

МАЛЯЎКА МІКОЛА АЛЯКСАНДРАВІЧ

АДНАВЯКОЎЦЫ

Вершы. Балады. Байкі

Рэдактар Р. М. Яўсееў. Мастак Ю. Ц. Цярэшчанка. Мастацкі рэдактар А. М. Малышава. Тэхнічны рэдактар Г. М. Тарасевіч. Карэктар Я. Ф. Харко.
ІБ № 2994
Здадзена ў набор 20.07.87. Падп. да друку 11.01.88. АТ 08012. Фармат 70×90$^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Ум. друк. арк. 5,27. Ум. фарб.-адб. 5,42. Ул.-выд. арк. 5,05. Тыраж 2600 экз. Зак. 615. Цана 70 к.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.